ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЕЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гарнаму Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня XV
№ 107 (4359)
СУБОТА, 14 мая 1932 г.

МЕНСК, Савецкая 63

СЁНЬНЯ У НУМАРЫ

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ—Шырокі ўдзел пралетарскай грамадзкасьці—асноўная ўмова посьпеху лесасплаву.

Б. ВОЛЬСКІ, М. МОДЗЭЛЬ—5 год яўрэйскага дзяржаўнага тэатру БССР (3 стар.).

В. ЯКУБАЙЛА—Гаспадарчы разрахунак—у саўгасы і МТС (2 стар.).

С. МЭЕРОВІЧ—Да чаго даводзіць работа па-старынцы (3 стар.).

П. АНДРОЎСКІ—Забойства прэзыдэнта францускай рэспублікі (4 стар).

Дззэртырам з фронту сацыялістычнага будаўніцтва ня месца ў радох партыі (2 стар.). Пастанова ЦК КП(б)Б аб рабоце калгаснай ячэйкі ў сувязі з веснавой сяўбой (2 стар.).

Змагацца за хутчэйшае завяршэньне перабудовы работы спажывецкай кааперацыі (2 стар.).

Неадкладна распачаць падрыхтоўку да асеньня-зімовых перавозак (з загаду тав. Андрэева—2 стар.).

Дружная работа францускага генштабу з фабрыкантамі антысавецкіх правакацый (1 стар.).

Шырокі ўдзел пралетарскай грамадзкасьці—асноўная ўмова посьпеху лесасплаву

Сплаў—адзін з адказных участкаў сацыялістычнага будаўніцтва. Выканаць поўнасьцю і ў тэрмін праграму сплаву—значыць, забясьпечыць бесьперабойную работу дрэваапрацоўчай, папяровай і раду іншых галін прамысловасьці, даць мільёны кбм. лесаматар'ялу для пасьпяховага ажыцьцяўленьня пляну капітальнага будаўніцтва, забясьпечыць гарады апалам, павялічыць валютны фонд краіны.

З гэтага відаць, якія вялізарныя і адказныя задачы стаяць перад сплаўной кампаніяй, а значыць і перад сплаўнымі арганізацыямі. Аднак, было-б у корані няправільна разглядаць сплаўную кампанію, як чыста ведамственную справу. Пасьпяховае завяршэньне ўсіх нашых гаспадарча-палітычных кампаній, у тым ліку і сплаўной, залежыць галоўным чынам ад актыўнага ўдзелу ў іх правядзеньні шырокіх працоўных мас, усёй савецкай грамадзкасьці.

Тэндэнцыі некаторых мясцовых арганізацый—зьвесьці сплаў да чыста ведамственнай справы—павінны разглядацца, як праяўленьне правага апартунізму на практыцы, як недаацэнка ўсёй важнасьці пасьпяховага выкананьня праграмы сплаву для паскарэньня тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва. Гэтыя тэндэнцыі, па-сутнасьці накіраваныя на зрыў кампаніі, павінны сустрэць рашучы бальшавіцкі адпор з боку партыйных арганізацый.

Тое, што сплаўная кампанія ў БССР праходзіць надзвычай павольнымі тэмпамі (на 1 мая пушчана ў сплаў усяго 16,5 проц. гадавога пляну), у значнай меры тлумачыцца слабай масавай работай сярод плытагонаў, невыстарчальным удзелам прафсаюзаў і камсамолу, адсутнасьцю канкрэтнага і апэрацыйнага кіраўніцтва з боку многіх мясцовых партыйных арганізацый. Адгэтуль зусім слабае разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва на сплаўных работах, невыстарчальная арганізацыя працы плытагонаў. Зараз мы маем такое становішча, калі ў большасьці сплаўных кантор і вучасткаў (Мазыр, Барысаў, Бабруйск, Рэчыца, Віцебск, Сураж, Гомель і інш.) брыгадны мэтад існуе фармальна; арганізаваныя брыгады па-сутнасьці нічым не адрозьніваюцца ад леташніх арцеляй, з тэй-жа абязьлічкай у рабоце і ўраўнілаўкай у зарплаце.

Брыгадзіры ў сваёй большасьці некваліфікаваныя; між тым, ад брыгадзіра залежыць многае, ён павінен ня толькі добра ведаць тэхніку сваёй справы, але і ўмець арганізаваць работу, правільна расставіць рабочую сілу ў брыгадзе. Лесбел і ЦП саюзу лесдрэўрабочых нядбайна адносьліся да гэтага адказнага вучастку работы. Праведзеныя курсы брыгадзіраў па 200 чал., з прычыны нядобраякаснага падбору кандыдатур, ня далі належных рэзультатаў.

Арганізацыя працы, на аснове брыгаднага мэтаду — важнейшая ўмова пасьпяховага выкананьня праграмы сплаву. Самай лепшай формай у гэтых адносінах зьяўляецца **сквазная брыгада**. Яна дае магчымасьць, шляхам правільнага ўнутранага падзелу працы (адначасовая вязка і сплаўка), арганізаваць бесьперапынны канвэер на сплаўных работах, што значна павышае прадукцыйнасьць працы. Таму асноўная ўвага павінна быць зьвернута на пашырэньне і ўмацаваньне гэтай формы арганізацыі працы плытагонаў.

Галоўнай прычынай слабай масавай работы на сплаве зьяўляецца адсутнасьць у большасьці сплаўных вучасткаў моцнага нізавога прафсаюзнага зьвяна. Ня гледзячы на тое, што сплаўныя работы вядуцца ўжо больш 2-х дэкад, прафсаюзная сетка знаходзіцца яшчэ ў стадыі арганізацыйнага афармленьня, прычым у брыгадах зусім адсутнічаюць прафарганізатары.

Такога становішча з прафсаюзнай работай на сплаве далей нельга цярпець. ЦП саюзу лесдрэўрабочых трэба неадкладна прыняць захады да таго, каб у бліжэйшыя дні ўсе нізавыя прафсаюзныя зьвенні былі ўмацаваны адпаведнымі кадрамі, каб кожная брыгада мела прафарганізатара. Толькі пры ўмове выстарчальнай увагі ўмацаваньню нізавога прафсаюзнага зьвяна магчыма наладзіць культурна-масавую работу на справе, шырока разгарнуць сацыялістычныя формы працы—сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Цельга абыйсьці міма таго факту, што рад арганізацый камсамолу Савецкай Беларусі, якія ў зімовых лесазагатоўках прынялі самы актыўны ўдзел, зараз у сплаўной кампаніі — адстаюць. Пастанова сакратарыяту ЦК КП(б)Б ад 4 красавіка 1932 году аб мабілізацыі на сплаў 1000 камсамольцаў дагэтуль яшчэ ня выканана. ЦК ЛКСМБ на сёнешні дзень ня ведае, колькі камсамольцаў працуе на сплаве.

Трэба ўказаць на няправільную ўстаноўку на сьцягваньне ўсіх мабілізаваных камсамольцаў у асобныя сплаўныя вучасткі. Гэта можа прывесьці да паслабленьня тэмпаў работы на астатніх. Камсамол павінен быць арганізатарам работы ня толькі на «камсамольскіх» рэчках, брыгадах, але і на ўсіх нізавых вытворчых вучастках. Вядучая роля камуніста і камсамольца на сплаве павінна вызначацца ступеньню выкананьня пляну тэй брыгадай, дзе ён працуе.

Мэханізацыя сплаўных работ—адна з асноўных умоў посьпеху кампаніі—недаацэньваецца многімі сплаўнымі арганізацыямі. У гэтым годзе ўпярэдыню ў БССР павінен быць устаноўлен плытавязальны варштат. Аднак, з прычыны зацяжкі мантажных работ ён дагэтуль яшчэ не працуе. Сэктар мэханізацыі Лесбелу і Мазырская сплаўная кантора, дзе павінен працаваць варштат, увесь час чакалі запасных частак, ня ўжывалі ніякіх мер да разгортваньня мантажных работ.

Маторны флёт на сплаве сёлета павінен быць значна павялічан. Усяго павінна працаваць 29 маторных лодак. На сёнешні-ж дзень пушчана ў эксплёатацыю толькі 13 лодак. Рэшта з прычыны зацяжкі рамонту ня можа быць скарыстана.

Рамонт мотафлёту недапушчальна зацягнуўся. Неабходны самыя рашучыя меры да максымальнага павышэньня тэмпаў рамонтных работ, каб на працягу бліжэйшых дзён, усе сплаўныя мэханізмы працавалі з поўнай нагрузкай.

Сплаўная кампанія зараз знаходзіцца ў такой стадыі, калі ўсялякія недахопы і прабелы можна выправіць і ліквідаваць на хаду. Патрэбна толькі гібкае і апэрацыйнае кіраўніцтва ўсімі вучасткамі сплаўных работ з боку мясцовых партарганізацый. Гэтаму ў максымальнай меры павінна садзейнічаць і тое, што сёлетні сплаў у выстарчальнай меры забясьпечан гужбой і такелажам. Справа са спаджэньнем плытагонаў таксама стаіць здавальняюча: на месцы дастаўлены прадуктовыя і прамтаварныя фонды, спэцвопратка, арганізавана шырокая сетка ларкоў (121), сталовак (158).

Праўда, на многіх вучастках яшчэ не наладжана, як сьлед, грамадзкае харчаваньне плытагонаў, але пры прыняцьці належных захадаў як з боку цэнтральных, так і мясцовых арганізацый, гэты вучастак работы таксама можна і трэба наладзіць.

Барацьба за няўхільнае далейшае паляпшэньне спажэньня рабочых на лесасплаве трэба паставіць як адну з важнейшых задач.

Барацьба за сплаў—барацьба за пасьпяховае выкананьне ўсяго народна-гаспадарчага пляну, за ўмацаньне тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва. Гэта добра разумее клясавы вораг, у першую чаргу кулак, які імкнецца перашкодзіць разгортваньню кампаніі. Яго мэта—пралезьці ў рады рабочых, каб шляхам распальваньня рвацкіх тэндэнцый у адсталых групах рабочых, развальваць брыгады з сярэдзіны і гэтым самым затармазіць тэмпы сплаву.

Вось чаму павышэньне клясавай пільнасьці, узмацненьне барацьбы з кулаком і яго агентурай—апартуністамі як на самым сплаве, так і непасрэдна ў вёсцы—першачарговыя задачы партыйна-камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый.

Толькі сплаўчэньнем усіх форм змаганьня за ўзмацненьне тэмпаў кампаніі, на аснове поўнай рэалізацыі шасьці ўмоў тав. Сталіна, можна дабіцца перамогі на сплаве

СЯЎБУ ТЭХКУЛЬТУР ПРАВЕСЬЦІ Ў ТЭРМІН

У АДКАЗ НА ПАСТАНОВЫ ЦК УсеКП(б) і СНК СССР ІЛЬНАВОДЧЫЯ МТС ПАВІННЫ ПАКАЗАЦЬ УЗОРЫ БАРАЦЬБЫ ЗА ПАВЯЛІЧЭНЬНЕ ТАВАРНАСЬЦІ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ГАСПАДАРКІ

Зацяжка сяўбы збожжавых тармозіць разгортваньне пасеву тэхкультур

Пасеў усіх яравых культур павінен быць скончан па БССР не пазьней 30 мая. У адпаведнасьці з гэтымі тэрмінамі, раёны паўднёвай і цэнтральнай зон павінны скончыць сяўбу 20 мая, а паўночнай — 30 мая.

8 мая мінуў апошні тэрмін скончэньня сяўбы ранніх яравых у цаўднёвых раёнах, а 15 надыходзіць першы тэрмін сяўбы тэхнічных культур.

Узоры барацьбы за своячасовае скончэньне пасеўнай кампаніі павінны быць паказаць **МТС**. Між тым, трэба прызнаць, што МТС праводзяць сяўбу зусім маруднымі тэмпамі. За апошнюю пяцідзёўку мы маем прырост па ўсіх культурах толькі на 2,8 проц. **На 10 мая ўсімі МТС засеяна 23.358 га, або 4,7 проц.**

Асабліва недапушчальнае адставаньне мы маем па засеву тэхкультур. Расьцягваньне тэрмінаў сяўбы ранніх яравых — вось адна з галоўных прычын, якая тармозіць своячасовы пасеў тэхкультур і ў першую чаргу ільну. Паводле апошняй зводкі, план па збожжавых МТС выканалі на 9,4 проц., па ільну — толькі на 1,1 проц.

Ня лепш праходзіць сяўба гародніх культур і траў. Па гародніне план выкананы на 0,4 проц. і травах — 1 проц.

Адным з асталых вучасткаў па-ранейшаму зьяўляецца **дрэнная арганізацыя працы.** На сёнешні дзень **Бялыніцкая, Капыльская і 2-я Менская МТС яшчэ не арганізавалі вытворчых вучасткаў і трактарных атрадаў.**

Пастаўленыя партыяй задачы аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў на данай арцельнай стадыі іх разьвіцьця і паляпшэньні забесьпячэньня гарадоў прадуктамі сельскай гаспадаркі натрабуюць ад МТС напружанай работы і сапраўднай арганізацыі калгаснай вытворчасьці.

Тэмпы сяўбы ў бліжэйшыя дні трэба значна ўзмацніць. МТС павінны разгарнуць бальшавіцкую барацьбу за выкананьне і перавыкананьне пасеўных плянаў, фарсаваць сяўбу збожжавых і забясьпечыць своячасовы пасеў вядучых культур: ільну, бульбы, гародніны і траў.

МТС, як адзін з важнейшых вагароў арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, павінны разгарнуць шырокую масавую работу па папулярызацыі апошніх пастаноў партыі і ўраду аб с.-г. падатку, збожжазагатоўках і жывёлазагатоўках сярод калгасьнікаў і шырокіх мас бяднацка-серадняцкіх гаспадарак адпаасобнікаў. Мабілізаваць шырокія працоўныя масы вёскі на стварэньне кармовай базы, павялічэньне ўраджайнасьці і прадукцыйнасьці жывёлагадоўлі.

МТС павінны стаць сапраўднымі арганізатарамі па вытворчасьці дадатковых рэсурсаў у сельскай гаспадарцы для разгортваньня калгаснага гандлю.

Зводка Беладдзяленьня Трактарацэнтру аб ходзе веснавой сяўбы па МТС на 10-V 1932 году

Назва МТС	Засеяна	Проц. выканаўня да агульнага пляну	У тым ліку збожжавых	У тым ліку ільну
Ільна-малочныя				
Асьвейская	323	4,6	207	116
Бешанковіцкая	—	—	—	—
Бялыніцкая	411	5,4	310	—
Боркавіцкая	—	—	—	—
Ветрынская	180	1,9	123	—
Горацкая	828	2,0	286	2
Гарадоцкая	8	—	4	—
Дрысенская	35	0,5	35	—
Дубровенская	289	2,7	274	—
Крупская	67	0,9	27	15
Лёзьнянская	98	0,8	86	12
Лепельская	335	2,3	42	7
Мсьціслаўская	808	7,1	462	80
Полацкая	70	0,9	35	—
Расонская	80	1,0	—	—
Сіроцінская	61	0,7	53	5
Сураская	—	—	—	—
Сеньненская	397	3,0	211	100
Талачынская	5	—	5	—
Вушацкая	320	3,5	25	26
Чавуская	328	4,2	251	—
Чашніцкая	99	1,3	69	8
Шклоўская	60	0,6	30	—
Усяго па ільна-малочн.	4.262	2,0	2.555	371
Бульбяна-жывёлагадоўчыя				
Бягомльская	107	1,1	69	—
Буда-Кашалёўская	851	6,8	671	68
Вузьдзенская	1422	17,7	591	3
Жлобінская	1237	17,9	855	31
Заслаўская	237	1,9	59	—
Касьцюковіцкая	698	6,9	676	—
Клімавіцкая	145	0,9	145	—
Койданаўская	1246	7,9	619	—
Капыльская	1120	12,1	716	4
Лагойская	24	0,3	3	—
Плешчаніцкая	1264	1,9	69	—
Пухавіцкая	115	1,3	75	—
Рагачоўская	354	5,9	276	4
Слуцкая	1117	12,7	822	22
Смалявіцкая	643	5,5	554	28
Ст.-Дароская	432	7,5	289	—
Танежыцкая	987	12,7	516	41
Цялуская	836	11,3	437	17
Церахаўская	435	4,5	422	5
Путчынская	52	0,6	49	—
Менская 11-я	—	—	—	—
Усяго па б.-жыв.	12.098	6,2	7.873	223
Жывёла-канаплян.				
Даманавіцкая	1725	27,8	1535	—
Жыткавіцкая	1421	26,2	883	78
Лельчыцкая	623	18,0	440	23
Старобінская	762	10,4	440	79
Тураўская	321	12,4	244	19
Усяго па ж.-канапл.	4.852	19,3	3.542	199
Садова-гародныя				
Аршанская	55	0,5	38	—
Барысаўская	74	1,0	46	—
Віцебская	—	—	—	—
Гомельская	352	4,9	191	—
Менская 1-ая	223	2,8	79	—
Магілёўская	35	0,5	81	—
Рэчыцкая	304	4,1	229	18
Усяго	1.043	1,9	614	18
Табачныя МТС				
Хойніцкая	1.103	17,1	814	12
Усяго па БССР	23.358	4,7	15.398	823
Па культурах—плян	—	—	162.548	72.186
проц. выкан.	—	—	9,4	1,1

УВАГА: 1) Бешанковіцкая, Бялыніцкая, Боркавіцкая, Талачынская, Клімавіцкая, Пухавіцкая, Менская 2-ая, Даманавіцкая і Віцебская МТС на 10-V вестак не прадставілі.

160 чал. для папулярызацыі пастаноў партыі і ўраду

МАГІЛЁЎ, 13. (Белта). У раёне пачалася шырокая растлумачальная работа вакол пастановы ЦК партыі і СНК СССР аб сельска-гаспадарчым падатку і збожжазагатоўках на 1932 год сярод калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў—аднаасобнікаў. На гэту работу мабілізован увесь вясковы актыў і брыгадзіры райкому партыі і райвыканкому, якія знаходзяцца на вёсцы.

Пастанова абмяркоўваецца на агульных сходах калгасных брыгад, у часе перапынкаў на полі, на сходах жанчын, моладзі.

10 мая ў сельсаветы і калгасы накіравана 160 студэнтаў саўпартшколы і палітасьветкамбінату.

Апошнія весткі з пасеўнага фронту

Сяўба яравых скончана

КОЙДАНАВА. Калгас «Беларускі батрак», Паланевіцкага сельсавету, 12 мая поўнасьцю закончыў сяўбу яравых і пераключыўся на дапамогу адстаючаму калгасу «Чырвоны Кастрычнік». Частку фуражных фондаў калгас «Беларускі батрак» перадаў калгасу «Чырвоны Кастрычнік». 13 мая ўсе коні з рабочай сілай накіраваны ў калгас «Чырвоны Кастрычнік» для аказаньня дапамогі.

***

ГЛУСК. (ПА ТЭЛЕГРАФУ). Саўгас «ХАРАМЦЫ» на 12 мая пасеяў 470 га яравога кліну, або 50 проц. пляну, саўгас «Вяснова» выканаў плян сяўбы на 60 проц. Па Кадкоўскім сельсавеце выканан плян сяўбы на 64 проц., па Латыскім—на 40 проц., Сімановіцкім—38 проц. Калгас «Новае жыцьцё» выканаў плян сяўбы на 45 проц., «Чырвоны штандар»—на 43 проц., «Серп і молат»—на 41 проц.

МАШЛАВЕЦ.

Пашырэньнем пасеваў тэхкультур

ільнаводчыя калгасы адказваюць на пастановы ЦК і СНК

ЛЁЗНА. (Па тэлеграфу ад нашага спэцкора).

У раёне шырока разгарнулася прапрацоўка пастановы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб збожжазагатоўках з уражаю 1932 году і новага закону аб сельска-гаспадарчым падатку. Гэтыя важнейшыя дакумэнты абгаворваны на нарадзе старшынь калгасаў раёну, якая адбылася 8-га мая. Аднадушна прынята рашэньне аб разгортваньні раньняй сяўбы ўдарнымі тэмпамі і датэрміновым скончэньні пасеўкампаніі. Упадзіваежным на сяўбе, якія працуюць у сельсаветах, ячэйкам КП(б)Б райком партыі прапанаваў дэтальна распрацаваць гэтыя пастановы ў ільным калгасе, саўгасе і вёсцы.

9-га мая адбыўся аб'яднаны сход калгасаў **«Новы сьвет»** і **«Колас»**, Чарніцкага сельсавету, дзе распрацаваны пастанова аб збожжазагатоўках і новы закон аб сельска-гаспадарчым падатку. У адказ на гэтыя пастановы калгасьнікі абавязаліся ўдарна правесьці сяўбу і ўборку, датэрміновы і поўнасьцю выканаць збожжазагатоўкі.

У мэтах стварэньня дадатковых рэсурсаў для разгортваньня савецкага гандлю пашырэсьцца яравы клін у гэтых калгасах па 20 га за кошт расшаткі цалінаў. Для павялічэньня стада малочных і сьвіных фэрм пашырэцца плошча пад пасеў кармовых траў. Плошча ільну пашырэцца на 13 га. Калгасьнікі абавязаліся дабіцца ўсёрнай пастаноўкі ўліку працы як на колькасьці, так і па якасьці, поўнага ўкараненьня зьдзельнічэньня. Пастаноўлена фарсаваць сяўбу на аснове працоўнай узаемадапамогі паміж калгасамі.

Сяваркі не скарыстоўваюцца, агрэхі мяркуюць задыскаваць

Прастоі трактараў у Лёзьнянскай МТС—рэзультат ганебных адносін да рамонту

ЛЁЗНА. На раённай нарадзе старшынь калгасаў, якая адбылася 8 мая, быў абмяркован ход веснавых палявых работ і сяўбы. Жорсткай і заслужанай крытыцы падпала работа Лёзьнянскай МТС.

Урачыстыя запэўненьні дырэктара МТС тав. Селіванава аб гатоўнасьці да сяўбы на справе аказаліся «очковтирательством». Да апошняга часу ні адзін атрад не разгарнуў работы. Зроблены толькі першыя спробы на Чарніцкім, Добрамысьлянскім і Бялыкавіцкім вучастках: трактары выйшлі на поле і... вярнуліся на базы.

Кіраўнікі вучасткаў і дырэктар МТС тлумачаць гэта «аб'ектыўнымі» прычынамі: гразка, рана пачынаць працу, справімся, летась пазьней пачыналі. Аднак, сапраўдная прычына ня ў гэтых апартуністычных разважаньнях.

На першых кроках работы МТС выяўляецца сапраўдная прычына прастояў—**дрэнны рамонт трактараў і прычэпнага інвэнтару.** У калгас «Бальшавік», Чарніцкага сельсавету, 17 красавіка прыбыў атрад з 6 трактараў. Праца не распачалася зусім, бо яшчэ ў дарозе сапсаваліся маторы, плугі і аўтаматы таксама аказаліся ніяпраўнымі. Тое самае ў Выдрэйскім сельсавеце. Нават горш, аказалася, што ў адным трактары няма... падшыпнікаў.

Карыстаючыся апартуністычным пастроем кіраўніцтва МТС, некаторыя трактарысты самавольна пакідаюць базы атрадаў і па некалькі дзён знаходзяцца па-за межамі вучастку.

Першыя дні сяўбы паказваюць, што МТС не арганізавала працу, не змагла спалучыць конскую і мэханічную цягавую сілу, ня стала арганізатарам калгаснай вытворчасьці.

Дырэктар МТС тав. Селіванаў, не зразумеўшы здаровай крытыкі старшынь калгасаў, зрабіў абтраюча бюракратычны, чыноўніцкі выпад, кінуўшы абвінавачаньне ўсёй нарадзе ў тым, што быццам усе яе ўдзельнікі «ня любяць трактараў, а машыны ня любяць толькі ворагі—кулакі».

Грозны і сьлепы адміністратар, які прабаваў задушыць самакрытыку, атрымаў належны адпор.

Калгасы, якія знаходзяцца ў радыўсе абслугоўваньня МТС, на конях у першую чаргу арэ, больш нізкія месцы, пакідаючы выпэйцы для трактараў. Гэтага ня ведае кіраўніцтва МТС, бо кіруе з габінэту.

У радзе калгасаў ворыва праведзена больш чым напалову. Частка глебы да сяўбы падрыхтавана. Трэба трактары пакінуць на скапчэньне ворыва, а конскую сілу—на фарсаванае разгортваньне сяўбы.

Якасьць працы патрэбна ўзьняць рашуча. У калгасе «Чырвоны Кастрычнік» увосень узьнята 160 га канюшынішча; гэта плошча засеяна з прапускамі, агрэхамі, асабліва па заваротах. Між тым, кіраўнікі МТС і ня думаюць выпраўляць гэтых упушчэньняў. У калгасе мяркуюць абмежыцца адным дыскаваньнем, тады, як тут неабходна даворваньне коннымі плугамі.

Наогул МТС не разгарнула рашучай барацьбы за ўзьняцьце ўраджаю. У калгасах, напрыклад, ігнаруецца радковы пасеў. Сяваркі, дзе яны і ёсьць, не скарыстоўваюцца. Брыгады ня ведаюць канкрэтна, дзе і што сеяць. Зусім ігнаруецца правядзеньне агратэхнічных мерапрыемстваў па паляпшэньні сенажацяй: усе лугавыя бораны стаяць на складах у цэнтры раёну.

Нарэшце, паасобныя сельсаветы проста скарачаюць плошчы засеву. Напрыклад, Высачанскі сельсавет скарацілі плян яравых на 332 га. Усё гэта праходзіць міма ўвагі кіраўніцтва як МТС, так сельсаветаў і партячэек.

А. Мікуцкі.

Дружная работа францускага генштабу

з фабрыкантамі антысавецкіх правакацый

У правакацыі Гаргулава францускі ўрад, яго дыплёматыя і паліцыя адыгрывалі першую ролю

ПАРЫЖ, 11. Паводле паведамленьня «Юманітэ», ёю атрыманы новыя доказы таго, што **«забойства прэзыдэнта Думэра зьяўляецца правакацыяй, у якой францускі ўрад і яго дыплёматыя, а таксама паліцыя адыгрывалі першую ролю».** «Юманітэ» прыводзіць паведамленьне з Бэрліну, надрукаванае ў № 11 органу Якаўлева «Набат» за красавік 1932 году. «Прадстаўнік арганізацыі — Якаўлеў, — паведамляецца ў «Набаце», — быў прынят панам Фрэнсуа Пуансэ, францускім паслом у Германіі» «Юманітэ» піша: «З аднаго боку француская паліцыя вельмі добра ведала, што задумвалася ў памяшканьні рэдакцыі газэты «Набат», дзе зьбіраўся гурток 15 тэрарыстаў, сярод якіх былі Гаргулаў і Якаўлеў. З другога боку, Якаўлева добра ведалі ў Бэрліне, дзе, паводле прызнаньня блізкіх да яго людзей, высьвятлілася, што ён, атрымліваў для выданьня свайго органа вялікія сумы грошай ад аднаго багатага рускага эмігранта ў Парыжы».

«Юманітэ» далей паведамляе, што Гаргулаў карыстаўся вельмі добрымі адносінамі з боку чэха-славацкага ўраду. У 1929 годзе Гаргулаў **прысьвеціў свой раман «Сын монашенкі» Масарыку — прэзыдэнту Чэха - славацкай рэспублікі.** У адказ на гэты гэст Гаргулаў атрымаў прывітальны ліст ад міністра замежных спраў Чэха - славакіі — Бэнэша і ад міністра юстыцыі, фінансаў і стэтс-сакратара міністра ўнутраных спраў.

«Юманітэ» канстатуе, што ў рэзультаце яе кошт - атакі буржуазны друк, які абвінавачваў Гаргулава ў «бальшавізьме» прымушан замаўчаць з прычыны адсутнасьці аргументаў для пацьвярджэньня свайго абвінавачаньня. Аднак, — указвае «Юманітэ», — **ёсьць доказы, што француская паліцыя мае дачыненьне да забойства».** «Юманітэ» прыводзіць наступныя факты: Гаргулаў быў у зносінах з паліцыяй праз рэдактара «Набату» Якаўлева, які ўцёк у Бэрлін, а таксама праз Кручкова — паліцэйскага агента на заводзе «Рэно» і праз праваката-ра Бурцава.

Далей «Юманітэ» напамінае, што «на выстаўцы кнігі ў доме Ротшыльда, у часе замаху на Думэра ня прысутнічаў прэфэкт паліцыі К'ян, а начальнік абшчынай паліцыі Гішар не арыштаваў Гаргулава, ня гледзячы на папярэджаньні яго з боку жонкі пісьменьніка Клод Фары». І, нарэшце, падкрэсьлівае «Юманітэ», — нібы выпадкова ніякія меры аховы ня былі прыняты паліцыяй у дзень замаху».

У канцы «Юманітэ» выступае з патрабаваньнем вытлачэньня з Францыі белагвардзейцаў і правакатараў.

БЕЛАБАНДЫТ ГАРГУЛАЎ АБ СВАЁЙ КОНТРРЭВАЛЮЦЫЙНАЙ ДЗЕЙНАСЬЦІ

ПАРЫЖ, 12. Паводле паведамленьня агрэсару, Гаргулаў учора пры допыце ў сьледчага, у прысутнасьці абаронцаў заявіў наступнае:

«Я нарадзіўся 29 чэрвеня 1895 году ў станіцы Лабінскай. Я адзінь сын багатага селяніна. Вучыўся ў народнай школе, потым у гімназіі ў Екацярынадары і на мэдыцынскім факультэце ў Маскве. З абвяшчэньнем войны на Расіі я быў уключан у казачы конны полк. На фронце я быў ранены ў галаву. Я прымаў удзел у баёх пад Ярославлем, Львовам, Каменец-Падольскім і два разы ўзнагароджан георгіўскімі крыжамі. У 1916 годзе я быў перавядзен на турэцкі фронт, дзе прымаў удзел у баёх ля Трапезунда. У 1918 г. Гаргулаў вярнуўся ў станіцу Лабінскую, дзе працаваў у мясцовай больніцы, будучы ў той-жа час членам казацкай падпольнай арганізацыі, якая паўстала супроць бальшавікоў у гэтым раёне. У рэзультаце гэтага паўстаньня быў забіт бацька Гаргулава, а сам Гаргулаў уцёк у горы ў станіцу Яраслаўскую, дзе ўступіў у партызанскі атрад генэрала Ляхава. З гэтым атрадам Гаргулаў прымаў удзел у захваце Армавіру і Стаўропаля. Неўзабаве Гаргулаў захварэў тыфусам, а пасьля выздараўленьня зноў пачаў вучыцца ў Ростове-на-Дану.

Далей Гаргулаў паведаміў, што ён два месяцы быў у Менску, дзе прымаў удзел у падпольнай арганізацыі Савінкава. У Менску-ж Гаргулаў стварыў паралельную подпольную арганізацыю, пад назвай «нацыянальна-рэспубліканскай дэмакратычны саюз». Гаргулаў, які праследаваўся органамі ЧК, уцёк у Польшчу, дзе ён сустрэўся з Савінкавым і сваімі расстрэльнымі прафэсарамі, высланымі савецкай уладай з СССР. У 1921 годзе Гаргулаў прыехаў у Прагу (ТАСС).

„Праскія паведамленьні"—творчасьць францускай ваеннай місіі

ПРАГА, 11. Можна лічыць, што **антысавецкая кампанія,** якая імкнулася паказаць забойцу Думэра ў якасьці «камуніста» і «савецка га агента», **правалілася.** Парыскі карэспандэнт сацыял - дэмакратычнай «Права - ліду» расцэньвае гэту кампанію, як **нязграбную спробу францускага ўраду апраўдаць нездольнасьць сваіх уласных органаў бясьпечнасьці,** якія дазваляюць рускім эмігрантам у Францыі жыць, як дзяржава ў дзяржаве. Газэта занялася праверкай правільнасьці «праскіх паведамленьняў» аб камуністычным членстве Гаргулава і канстатуе, што **ні адна ўрадавая інстанцыя не пасылала падобных паведамленьняў у Парыж.** Газэта заяўляе, што **гэтыя недарэчныя паведамленьні выходзяць ад францускай ваеннай місіі ў Празе,** якая на сваю рызыку і страх робіць» абсьледаваньне жыцьця Гаргулава ў Чэха - Славакіі»

УЗЬНЯЦЬ УРАДЖАЙНАСЬЦЬ БУЛЬБЫ—БАЯВАЯ ЗАДАЧА ДНЯ

З пастановы калегіі Наркамзему і праўленьня Калгасцэнтру БССР

У веснавую кампанію 1932 году калгасы Беларусі павінны дабіцца ўзьняцьця ўраджайнасьці бульбы з тым, каб атрымаць ня менш 130 цэнт. з га. Калегія Наркамзему і праўленьне Калгасцэнтру абавязвае ўсе райза, праўленьні калгасаўзаў, калгасаў, дырэктароў МТС ажыцьцявіць у часе веснавога і летняга сэзону рад важнейшых агратэхнічных мерапрыемстваў, якія забясьпечаць узьняцьце ўраджайнасьці бульбы. Галоўнейшыя з іх наступныя:

Пад пасеў бульбы трэба вызначаць вучасткі з-пад угноенай азіміны, лубіну, бабовых траў, высяваючы на папары выключна ранняя гатункі бульбы пераважна на лёгкіх глебах. Як правіла, бульбу трэба высяваць у добра апрацаваную пульхную глебу, абавязкова на раньнім зяблявым ворыве. Раньняй вясной правесьці баранаваньне зяблева, а на больш цяжкіх глебах (суглінках і глінах) і пераворваньню на глыбіні 10-12 сант. з паўторным баранаваньнем. Пры адсутнасьці зяблева, ворыва трэба праводзіць з першым выхадам ў поле, на глыбіні 15-19 сант. і праз 3-5 дзён баранаваньне.

Як правіла, бульбу трэба высяваць толькі на ўгноеных глебах. Гной упосіцца пад азімыя, як папярэднік бульбы, або з восені, пад зяб. Пры веснавой вывазцы гною трэба ў першую чаргу вывозіць конскі, або добра перапрэўшы гной у колькасьці 180-230 цэнтн. на га. Раскідваць і заворваць гной абавязкова ў дзень вывазу і з угрэваньнем ў барозны. Пры недахваце гною трэба ўносіць у глебу торф, загатоўлены з восені і кампаставаны з гноем або проста сухі, добра праветраны, у колькасьці 30-60 тон на адзін га, пад першае ўзворваньне. Попел ўносіцца ў глебу ў колькасьці 7-10 цэнтн. на 1 га. Пры наяўнасьці мінэральных угнаеньняў трэба ўносіць: касьцяной мукі—4-6 цэнтн., сільвініту—3-4 цэнтн. пад першае ўзорваньне, суперфасфату—2-4 цэнтн. за тыдзень да пасадкі бульбы.

Пры ўскрыцьці буртоў трэба зрабіць пераборку бульбы, якая падзяляецца на тры групы: сярэднюю, вялічынёй з курынае яйко, дробную і буйную. Сярэднюю бульбу скарыстаць для квадратнай пасадкі, буйную разрэзаць па 2-3 часткі. Рэзаць бульбу трэба толькі ўздоўж, з тым, каб палавінкі рэзанай бульбы мелі адналькавую колькасьць вочак (ня менш 3-5) і адналькавую вагу (ня менш 50 грам). Пры пераборцы трэба вылучаць гатункоўую бульбу з тым, каб высяваць яе на паасобных вучастках.

Пасадку бульбы неабходна праводзіць разам з сяўбой яравых і скончыць у раёнах паўднёвай зоны не пазьней 15, цэнтральнай зоны — 20 і паўночнай зоны — 25 мая. Ва ўсіх калгасах трэба арганізаваць пасадку бульбы двума спосабамі: квадратную па маркёру (метчыку), пасадку пад плуг і бульбасажалкамі, дзе такія ёсьць. Асабліва трэба дабівацца шырокага ўкараненьня пасадкі бульбы па маркёру, што забясьпечыць значную эканомію насеньня і высокі ўраджай. Пры пасадцы па маркёру перад пасевам трэба ўзараць поле на поўную глыбіню (15-18 сант.), добра прабаранаваць і прыкатаць лёгкім каткам, пасьля чаго маркёрам правесьці барозны ўздоў

Аб рабоце калгаснай ячэйкі ў сувязі з веснавой сяўбой

Пастанова ЦК КП(б)Б

1. ЦК КП(б)Б зварачае ўвагу ўсіх партыйных арганізацый КП(б)Б на тое, што важнейшай умовай у справе пасьпяховага разгортваньня і правядзеньня веснавой сяўбы зьяўляецца арганізацыйнае замацаваньне і сапраўднае разгортваньне партыйна-масавай работы калгаснай ячэйкі

Вузлавым пытаньнем работы калгаснай ячэйкі і кожнага камуніста паасобна павінна зьявіцца правядзеньне ў жыцьцё пастаноў ЦК УсеКП(б) аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, арганізацыі брыгад і барацьбе з прымусовым аграмаджаньнем кароў і дробнай жывёлы.

ЦК абавязвае ўсе райкомы КП(б)Б, калгасныя ячэйкі і ўсіх камуністаў-калгаснікаў,—на падставе сапраўднага правядзеньня ў жыцьцё пастановы ЦК аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў—мабілізаваць калгасныя масы на тэрміновы выхад у поле і забясьпечыць поўнае выкананьне пляну засеву калгасных плошчаў, дабіўшыся высокіх якасных паказальнікаў у правядзеньні пасеўнай кампаніі.

2. Прапанаваць РК КП(б)Б арганізаваць у рашаючых паляводчых брыгадах партыйныя і камсамольскія групы, а дзе менш 3-х камуністаў або камсамольцаў—вылучыць у кожнай брыгадзе парт. і камсамольскіх арганізатараў. Дабіцца такой расстаноўкі партыйных і камсамольскіх сіл у калгасе, каб у кожнай брыгадзе было забясьпечана партыйна-камсамольскае ядро.

З гэтай мэтай—райкомам перагледзець склад камуністаў калгасных, сельсаветскіх і інш. сельскіх ячэек, забясьпечыўшы адпаведную перагрупоўку камуністаў па калгасных ячэйках і ўнутры кожнай калгаснай ячэйкі. Прымацаваць да брыгад для вядзеньня партыйна-масавай работы ўвесь кіруючы склад ячэек, сельсаветаў, сельпо і праўленьняў калгасаў.

3. Даручыць РК КП(б)Б у відзе вошыту арганізаваць у брыгадах асобных калгасаў трыкутнікі ў складзе брыгадзіра, груп-парторга або парторга і кіраўнікоў вытворчай нарады для папярэдняга абгаварэньня і вызначэньня мерапрыемстваў па лепшай арганізацыі работы і выкананьня вытворчых пляпаў.

4. Усю агітацыйна-масавую і культасьветную работу калгасных ячэек, сельсаветаў, сельпо, школ, аграпомаў перанесьці ў брыгады, у поле. У цэнтры агітацыйна-масавай культасьветнай работы паставіць барацьбу за ўмацаваньне брыгад, за мабілізацыю пасеўных фондаў, за свячасовае сканчэньне і лепшыя якасныя паказальнікі сяўбы, за лепшае захаваньне жывога і мёртвага інвэнтару.

Камуністы і камсамольцы павінны ўзяць на сябе ініцыятыву ў арганізацыі сацспаборніцтва і ўдарніцтва як унутры брыгад, так і паміж брыгадамі данага калгасу. У цэнтры сацспаборніцтва паставіць пытаньне лепшых паказальнікаў па нормах выпрацоўкі і якасьці праведзенай работы.

5. Парт'ячэйкі павінны зараз-жа разгарнуць шырока растлумачальную работу сярод калгасьнікаў аб тым, што апэнка працадня калгасьніка будзе праводзіцца ў залежнасьці ад пасьпяхова праведзенай работы брыгады, выкананьня колькасных і якасных паказальнікаў, арганізаваўшы прэміяваньне калгасьнікаў і брыгад, даўшых лепшыя паказальнікі па нормах выпрацоўкі і якасьці работ.

6. Забясьпечыць рэгулярнае скліканьне сходаў агульна-партыйных і камсамольскіх ячэек для абгаварэньня ходу сяўбы, работы асобных брыгад і намячэньня практычных мерапрыемстваў па забясьпячэньні якасных і колькасных паказальнікаў пасеўнага пляну.

7. Зараз-жа арганізаваць ва ўсіх калгасах і брыгадах работу вытворчых нарад, вылучыўшы для кіраўніцтва вытворчымі нарадамі праверэных калгасьнікаў з ударнікаў і актыву.

Увесьці ў практыку скліканьне 5-10 хвілінных лятучых вытворчых нарад перад пачаткам і па сканчэньні работы брыгад для найбольш правільнага разьмеркаваньня заданьняў членам брыгады і для падвядзеньня вынікаў работы брыгады за дзень.

8. Паставіць задачай калгаснай ячэйкі—арганізацыю рэгулярнага выпуску брыгаднай насьценгазэты або «Ільлічоўкі», у якой шырока асьвятляць вынікі сацспаборніцтва і ўдарніцтва, выкананьне норм выпрацоўкі, работы лепшых ударнікаў і партыйна-масавай работы.

Зьвярнуць асаблівую ўвагу на арганізацыю дзіцячых пляцовак, ясьляй і г. д.

9. Сакратарыят ЦК КП(б)Б зварачае асаблівую ўвагу ўсёй партыйнай арганізацыі на тое, што кулацкія і контр-рэвалюцыйныя элемэнты вёскі спрабуюць дэзарганізаваць рад калгасьнікаў, справакаваць іх на выхад з калгасаў і гэтым самым сарваць плян трэцяй бальшавіцкай сяўбы.

Задачай усіх партыйных арганізацый, кожнай калгаснай ячэйкі, кожнага камуніста, камсамольца і калгасьніка паасобна зьяўляецца мабілізацыя ўсёй калгаснай масы для сакрушальнага адпору контр-рэвалюцыйным кулацкім вылазкам.

ГК, РК партыі, калгасныя ячэйкі і ўсе партыйна-камсамольскія арганізацыі павінны на падставе сапраўднага бальшавіцкага правядзеньня ў жыцьцё пастановы ЦК УсеКП(б) аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, мабілізаваць калгасны актыў і ўсіх калгасьнікаў, а таксама бядняцка-серадняцкія масы адназасобнікаў на барацьбу з контр-рэвалюцыйнай работай кулацтва, па барацьбу з яго спробамі разваліць калгасы і сарваць веснавую сяўбу, арганізуючы калгасьнікаў, беднату і серадняка вакол задач умацаваньня існуючых калгасаў і далейшай калектывізацыі вёскі.

Дэзэртырам з фронту сацыялістычнага будаўніцтва—ня месца ў радох партыі

Сёньня друкуецца пастанова партколегіі ЦКК КП(б)Б аб выключэньні з партыі т. т. Гершановіча, Гінтаўта і Госа.

Тав. Гершановіч—член партыі з 1925 году, скончыў курсы чырвоных дырэктароў, пасьля чаго, згодна пастановы ЦК КП(б)Б, некалькі месяцаў працаваў намесьнікам дырэктара аднаго з торфазаводаў БССР. Гершановіч выключан з радоў партыі за тое, што ён замест бальшавіцкай работы па выкананьні даручанага яму партыяй абавязку, у самы разгар веснавых торфараспрацовак — рашаючых дзён здабываньня торфу—катэгарычна адмовіўся працаваць на заводзе і самавольна кінуў работу. Свой дэзэртырскі ўчынак Гершановіч імкнуўся вытлумачыць тым, што ён «не знаём з даручанай яму работай», што пасьлі на торфазавод ёсьць вынік яго асабістых спраў з адказнымі работнікамі Белторфу.

Аднак, справа ня ў гэтым. Тав. Гершановіч спалохаўся тых труднасьцяй, якія яму сустрэліся на рабоце, але якія на аснове бальшавіцкай настойлівасьці, на аснове аўладаньня тэхнікай, глыбокага вывучэньня ўмоў і сутнасьці вытворчасьці яму патрэбна і можна было пры дапамозе і кіраўніцтве з боку партыйнай арганізацыі з посьпехам перамагчы.

Тав. Гершановіч не хацеў зразумець гэтага, забыўшы, што ён камуніст, што яго першачарговы абавязак—безагаворачна праводзіць у жыцьцё ўказаньні партыйнага органу.

Аналёгічныя ўчынкі былі дапушчаны з боку тт. Госа і Гінтаўта (апошні, працуючы ў Менску на пасадзе загадчыка аддзелу збыту хлебазаводу, адмовіўся выканаць пастанову ЦК аб прызначэньні яго на працу ў сельсавет).

Гэтыя людзі, падпаўшы пад уплыў дробна-буржуазнага асяродзішча, перарадзіліся ў абываталяў з партыйным білетам, для якіх свае асабістыя справы вышэй партыйных і грамадзкіх абавязкаў.

У свой час парткалегія ЦКК у пастанове ад 30 чэрвеня 1931 г. папярэдзіла «ўсіх членаў партыі, што выпадкі адмаўленьня ад паездкі для ўмацненьня работы ў раёны, сельсавет, калгас, саўгас і г. д., ці самавольныя выезды адтуль будуць разглядацца, як самае цяжкае партыйнае злачынства і пры выяўленьні злосных фактаў віноўныя будуць прыцягвацца да суровай партыйнай адказнасьці аж да выключэньня з партыі».

Гэта пастанова ня была заўважана Гершановічам, Гінтаўтам і Госам. Захопленыя клопатамі аб сабе, яны нарушылі адну з рашаючых умоў маналітнасьці і непераможнасьці партыі—партыйную дысцыпліну.

Справа гэтых гора-камуністаў павінна паслужыць сур'ёзным урокам для тых, хто ня лічыць для сябе справай гонарам выконваць даручэньні партыі, хто забыў дырэктыву XVI зьезду УсеКП(б):—«Даваць бязьлітасны адпор усім спробам хістаць і падрываць сталёвую партыйную дысцыпліну і адзінства ленінскай партыі».

П. Пасюкевіч.

Пастанова парткалегіі ЦКК КП(б)Б ад 29-IV- 1932 г.

Заслухаўшы паведамленьне члена парткалегіі тав. Пасюкевіча пра невыкананьне пастановы ЦК КП(б)Б аб паездцы на работу ў раён і на торфараспрацоўкі т.т. Гінтаўтам, Гершановічам і Гос, парткалегія ЦКК КП(б) пастанаўляе:

1. **Гінтаўт** Франц Станіслававіч, г. парадж. 1903, член КП(б)Б з 1928 году, рабочы, адукацыя ніжэйшая, у момант узьнікненьня справы працаваў загадчыкам аддзелу збыту хлебазаводу (Менск). Пастанавілі: за катэгарычнае адмаўленьне ад выкананьня пастановы ЦК аб паездцы на работу старшынёй сельсавету—з радоў партыі выключыць.

2. **Гершановіч** Барыс Абрамавіч, год нарадж. 1904, член КП(б)Б з 1925 г., скончыў курсы чырвоных дырэктароў. За ўпартае нежаданьне выканаць пастанову ЦК аб паездцы на работу нам. дырэктара торфазаводу--з радоў партыі выключыць.

3. **Гос** Залман-Наум Абрамавіч, год нарадж. 1896, член КП(б)Б з 1931 г., рабочы-кравец, скончыў курсы чырвоных дырэктароў. За катэгарычнае адмаўленьне ад выкананьня пастановы ЦК аб паездцы на работу нам. дырэктара торфазаводу—з радоў партыі выключыць.

4. Паставіць інфармацыю аб справах т.т. Госа, Гершановіча і Гінтаўта на адкрытых сходах адпаведных парткалектываў, на вучоце якіх памянёныя таварышы знаходзяцца

ЯЧЭЙКІ АСОАВІЯХІМУ І ВУЧЭБНЫЯ ПУНКТЫ

Вайсковая падрыхтоўка складае **асноўную галіну** работы Асоавіяхіму. Асабліва вялікае значэньне набывае пытаньне **барацьбы за якасьць** вайсковай падрыхтоўкі, за сапраўднае **аўладаньне вайсковай тэхнікай.**

Ускладненьне задач Асоавіяхіму выклікала неабходнасьць пераходу ад сыстэмы вайсковых гурткоў да больш павышаных форм—**вучэбных пунктаў**, якія зьяўляюцца цэнтрам, дзе згуртавана ўся матар'яльная база і неабходныя вайскова-палітычныя кадры.

Адсюль вучэбны пункт зьяўляецца грунтоўнай формай, якая забясьпечвае якасьць усёй вайскова-палітычнай падрыхтоўкі, зьберажэньне матар'яльнай часткі і мэтазгоднае скарыстаньне зброі.

Аднак, практыка работы паказвае, што пры перабудове вайсковай работы, шляхам пераводу яе па вучэбны пункт, многія арганізацыі, як, напрыклад, Менская, Барысаўская, Магілёўская, Полацкая, Заслаўская, Крычаўская **не зразумелі сутнасьці ўдзелу ў гэтай рабоце нізавой ячэйкі.**

Вайсковая падрыхтоўка членаў Асоавіяхіму ва многіх выпадках мэханічна пераносіцца на вучэбны пункт і тым самым зьнижаецца роля нізавой ячэйкі. Замест таго, каб арганічна ўвязваць работу ячэйкі і вучэбнага пункту, выразна акрэсьліць ролю ячэйкі, як **арганізатара**, частка райсаветаў стала на шлях мэханічнай перадачы функцый ячэйкі вучэбнаму пункту.

Тут асноўная памылка заключаецца ў тым, што ячэйка Асоавіяхіму пасутнасьці адрываецца ад работы вучэбнага пункту.

Пры арганізацыі вучэбных пунктаў **неабходна весьці самую жорсткую барацьбу з ігнараваньнем нізавой ячэйкі.** Трэба памятаць, што ячэйка зьяўляецца моцным вагаром мабілізацыі членскіх мас вакол задач навучаньня і абсталяваньня вучэбных пунктаў.

Некалькі слоў аб самой рабоце вучэбных пунктаў.

Падалей, як правіла, вучэбныя пункты павінны працаваць бесьперапынна, а работу іх неабходна прыстасоўваць да ўмоў вытворчасьці, умоў пматазьменнай сыстэмы. Асноўныя формы навучаньня павінны ўжывацца такія, якія забясьпечылі-б якасьць вайскова-палітычнай падрыхтоўкі ў адпаведнасьці з запатрабаваньнем тэхнічнай рэканструкцыі Чырвонай армії. Важнае значэньне мае наглядная асьць абучэньня, трэніроўка на сапраўдных экспанатах.

Для абслугоўваньня асоавіяхімаўскіх членскіх мас у сацыялістычным сэктары вёскі, там, дзе немагчыма арганізацыя стацыянарных вучэбных пунктаў прамысловага тыпу, неабходна перайсьці да арганізацыі **перасовачных вучэбных пунктаў.** Такая форма існуе **ўжо ў Віцебску і Воршы.**

Перасовачныя вучэбныя пункты гаксама даюць шырокую магчымасьць для разгортваньня вайскова-палітычнай вучобы. На гэтых пунктах неабходна падбіраць кіруючы склад у залежнасьці ад спэцыяльнасьцяй, якія падрыхтоўваюцца.

Пункты павінны свячасова забясьпечвацца матар'яльнай базай і накіроўвацца па раней выпрацаваным маршруце для аказаньня дапамогі нізавым ячэйкам Асоавіяхіму ў справе разгортваньня вайсковай падрыхтоўкі працоўных у калгасах, саўгасах, МТС.

Работнікі перасовачнага вучэбнага пункту павінны сваю работу строга ўвязваць з ячэйкамі Асоавіяхіму і дапамагаць апошнім.

Там, дзе немагчыма абслугоўваць асоавіяхімаўскія масы як стацыянарнымі, так і перасовачнымі вучэбнымі пунктамі, усё навучаньне трэба праводзіць праз формы **вучэбна-страхавых адзінак** з улікам патрэбных спэцыяльнасьцяй. Лік вучэбна-страхавых адзінак залежыць ад колькасьці тых, што навучаюцца. Пры малой-жа колькасьці павінны арганізоўвацца **гурткі вайсковых ведаў,** закліканыя даць першапачатковыя веды ў вайсковых пытаньнях.

Праз сыстэму арганізацыйна-масавай работы неабходна побач са стралковымі гурткамі шырока папулярызаваць тэхнічныя гурткі, напрыклад, гурткі сувязі, сапёрна-маскіровачныя, хэмічныя і г. д.

Зразумела, што гурток можа добра працаваць толькі тады, калі будзе забясьпечан належнымі кадрамі кіраўнікоў і калі гэтыя кадры будуць замацаваны да канца работы.

Кожная з высунутых форм вайсковай падрыхтоўкі павінна ўжывацца ў залежнасьці ад умоў работы ячэйкі і без абасабленьня, дапаўняць адна адну. Побач з гэтым, усю вайсковую работу неабходна шырока папулярызаваць праз формы і мэтады агітацыйна-масавай работы.

У разгортваньні работы вялікую ролю адыгрывае друк і асабліва нізавы. Рабоце стацыянарных і перасовачных вучэбных пунктаў, а таксама гурткоў і страявых адзінак—насьценныя, штодзенныя газэты і раённы друк павінны аддаваць належную ўвагу, шырока асьвятляючы як станоўчыя, так і адмоўныя бакі ў вайсковай падрыхтоўцы працоўных.

В. Ратабыльскі.

НЕАДКЛАДНА РАСПАЧАЦЬ ПАДРЫХТОЎКУ ДА АСЕНЬНЯ-ЗІМОВЫХ ПЕРАВОЗАК

З загаду тав. Андрэева

У цэнтральным друку абвешчан загад НКШЗ ад 9 мая 1932 г. аб падрыхтоўцы чыгунак да асеньня-зімовых перавозак. У загадзе гаворыцца:

1932 год, на працягу якога завяршаецца выкананьне пяцігодкі і значна ўзрастае працуючая рашаючых галін народнай гаспадаркі (вугаль, мэталь, машынабудаўніцтва, сельская гаспадарка), патрабуе мабілізацыі рэсурсаў транспарту і максымальна выразнай работы ўсіх яго зьвеньняў, асабліва ў надыходзячы асеньня-зімовы перыяд 1932 г.

Неабходны посьпех у гэтым напрамку павінен быць забясьпечан на аснове сапраўднага ажыцьцяўленьня 6 умоў тав. Сталіна, канчатковага замацаваньня спаранай язды на паравозах, дасканалага выкананьня праграмы летняга рамонту, разьвіцьця работы транспарту ў летнія месяцы, у прыватнасьці, па летнім завозе ў пункты спажываньня масавых грузаў (руды, вугалю, дроў і інш.) на аснове шырокага разгортваньня барацьбы за працоўную дысцыпліну, за выразную арганізацыю і ўшчадкаваньне ўсёй работы, за бярэслівыя адносіны да скарыстаньня маемасьці транспарту, за поўнае спыненьне бою вагонаў на сартавачных горках і пры маноўрах на станцыях, барацьбы за чыстату і парадак на станцыйных шляхох, за арганізацыю дасканалага тэхнічнага агляду рухомага складу ў дарозе, за поўнае спыненьне псаваньняў і страт грузаў, якія перавозяцца.

У мэтах свячасовай падрыхтоўкі чыгуначнага транспарту да асеньня-зімовых перавозак, наркамшляху тав. **Андрэеў** прапануе:

Галоўнаму чыгуначнаму будаўніцтву і дырэкцыям чыгунак для павялічэньня прапускной здольнасьці рашаючых і найбольш загружаных напрамкаў на працягу II і III кварталаў (Ленінград-Новасібірск-Чалябінск-Магнітагорск, Данбас-Валуйкі-Елец - Масква, Данбас - Ленінград і г. д.) згрупаваць усе сродкі, у першую чаргу на ўказаных напрамках, палажа **пабудаваць на іх ня менш 1.900 км.** галоўных шляхоў, зрабіць разьвіцьцё станцый з укладкай **ня менш 529 км. новых станцыйных шляхоў,** разьвіць дапаўнія абсталяваньні **з пабудовай нанава 267 дэпаўскіх стойлаў** і г. д.

Галоўнаму чыгуначнаму будаўніцтву і дырэкцыям дарог, апрача новабудоўляй, прапанавана забясьпечыць зпачу ў эксплёатацыю: а) **лініі Мельнікава-Шураб,** працягам 52 км.—да 1 кастрычніка б. г.; б) **Катарскай лініі,** працягам 39 км. — да 1 кастрычніка б. г., в) **лініі Сьвярдлоўск-Курган** — працягам 363 км. — да 1 лістапада б. г., г) **лініі Бранск-Вязьма,** працягам 234 км. — да 1 сьнежня б. г.

Кіраўніцтву шляху правесьці да пачатку асеньня-зімовых перавозак па рашаючых напрамках чыгуначнай сеткі работы па капітальным рамонце **41.000 км.** разгорнутага галоўнага шляху; пры гэтым зьмяніць рэйкі на 3.215 км.; скарэляваў—21,09 тон; зьмяніць і падаць шпалы 16.631.600 шт.

Паводле загаду, да 1 верасьня ці вітна быць прапушчана праз спэцыяльны аздараўленчы рамонт на ўсіх дарогах сеткі 11.400 паравозаў. Лік хворых паравозаў у сярэднім па сеткі, уключаючы паравозы, якія знаходзяцца ў прамыўцы, замест 4.031 адзінкі або 22,7 проц. ад парку ў пачатку другога кварталу давесьці да 1 кастрычніка да лічбы ня вышэй 3.230 адзінак, або 17 проц. агульнай наяўнасьці паравозаў у эксплёатацыйным парку. Забясьпечыць выкананьне ў 1932 г. такой праграмы работ па разьвіцьці дэпаўскіх абсталяваньняў, якая зьявілася-б пачаткам разгорнутай рэканструкцыі дэпаўскай гаспадаркі шляхоў, у першую чаргу на рашаючых напрамках сеткі.

Да 15 жніўня павінна быць прапушчана праз перыядычны агляд на заводах, якія знаходзяцца ў вежэньні дарог, 26.000 вагонаў. На аснове выпачатанай праграмы рамонту давесьці лік хворых вагонаў ня вышэй 1,7 проц. ад агульнай наяўнасьці вагонага парку сеткі, а на пыстэрнах — ня вышэй 1 проц.

31 чэрвеня скасоўваюцца палегчаныя ўмовы тэхнічнага абмену вагонамі паміж дарогамі, забясьпечыўшы выкананьне неабходнага рамонту вагонаў у абменных пунктах у поўным аб'ёме.

На працягу 1932 году павінна быць закончана абсталяваньне сэлектарнай тэлефоннай сувязі ўсёй сеткі чыгунак, за выключэньнем невялікага ліку маладзейных участкаў. Да 1 жніўня адкрыецца простая тэлефонная сувязь паміж Масквой і Тыфлісам. Да 1 кастрычніка павінна быць арганізавана 7 перасовачных калён па мэханізацыі пагрузачна-разгрузачных работ.

Дырэкцыям дарог прапанавана забясьпечыць на працягу асеньня-зімовага перыяду 100-процантнае сьцьвярджэньне пасажырскіх цягнікоў паводле раскладу.

У адносінах пытаньня зарплаты на рашаючыя вузлы і пункты каманды руецца на паўтара-два месяцы рад кіраўнічых работнікаў НКШЗ і дырэкцый дарог для вывучэньня вопыту і дапамогі мясцом у ліквідацыі ўраўніловкі. Да 1 чэрвеня ў Наркамшляху павінна быць падана залога дырэктарамі дарог на патрэбны лік грузчыкаў, заключаны дагаворы з калгасамі і саўгасамі на рабочую сілу і г. д.

Плян жыльлёвага будаўніцтва зацьверджан на суму 51.250.000 руб. На жыльлёвае будаўніцтва для інжынэрна-тэхнічнага персоналу адпускаецца з мэтавага фонду 10 млн. руб.

Для праверкі ходу падрыхтоўкі да асеньня-зімовых перавозак па месцы камандзіруецца на агэнт месяц рад кіруючых работнікаў НКШЗ.

Гадавіна майскай адозвы ЦК, СНК і Цэнтрасаюз

Змагацца за хутчэйшае завяршэньне перабудовы работы спажывецкай каапэрацыі

У адзнаку гадавіны майскай адозвы ЦК УсеКП(б), СНК і Цэнтрасаюзу аб перабудове спажывецкай каапэрацыі 12 мая адбылося ўрачыстае пасяджэньне Менгарпрафсавету, трыкутніку Белкаапсаюзу, разам з каапэрацыйным і прафэсыянальным актывам і ўдарнікамі менскіх прадпрыемстваў.

У прэзыдыум былі выбраны т. т. **Гікало, Шаранговіч, Жаброўскі, Рыскін, Іваноў, Галадзед, Рыжэў, Калнін, Кавальчук, Шпэктараў, Гентнэр, Хадасевіч, Хаскін, Царонак, Верба, Рудэн, Шулькін** і інш.

У сваіх прамовах старшыня гарпрафсавету тав. Шулькін і намесьнік старшыні Белкаапсаюзу тав. Верба далі аналіз работы спажывецкай каапэрацыі БССР за мінулы год.

Дакладчык тав. Верба побач з пэўнымі дасягненьнямі ў перабудове каапэрацыі прывёў шмат фактаў нягібкасьці і непаваротлівасьці раду каапэрацыйных арганізацый у справе рабочага снабжэньня, наяўнасьці ўтрыманчых настрояў, падзейна цэнтралізаванае снабжэньне, скажэньня савецкай палітыкі цэн.

Факты масавых пакраж, разбазарваньня хлеба і мясных прадуктаў, якія былі выкрыты за апошні час у Менску і некаторых іншых раёнах, сьведчаць аб наяўнасьці чужога, варожага элемэнту ў апараце каапэрацыі, аб неналаджанасьці штодзённага рабочага кантролю зьнізу.

Прафсаюзныя арганізацыі не паставілі работу так, каб забясьпечыць удзел шырокіх мас рабочых кожнага прадпрыемства ў рабоце каапэрацыі. Гэты вучастак найбольш слабы.

Пастановы ЦК партыі і СНК аб пляне збожжазагатовак і разгортваньні калгаснага гандлю збожжам, аб пляне жывёлазагатовак і аб мясным гандлі прадугледжваюць шырокае разгортваньне калгаснага гандлю збожжам і мясам на савецкіх рынках. Разьвіцьцё калгасных рынкаў дасьць магчымасьць значна палепшыць рабочае снабжэньне.

Змагаючыся няўхільна за далейшае паляпшэньне рабочага снабжэньня, за разгортваньне савецкага гандлю, неабходна ўзмацніць агонь супроць прыхільнікаў мэханічнага разьмеркаваньня, супроць буржуазных тэндэнцый і цэпманскага духу ў гандлёвай рабоце, супроць парушальнікаў прынцыпаў савецкага гандлю і савецкай палітыкі цэн.

***

На гэтым-жа пасяджэньні рабочыя буйнейшых менскіх прадпрыемстваў і ЗРК рапартавалі гаркому партыі, гарпрафсавету і Белкаапсаюзу аб дасягненьнях у перабудове каапэрацыйнай работы.

У радох перадавікоў ЗРК «Мэталіст», які абслугоўвае рабочых заводаў імя Варашылава і Молатава.

ЗРК «Мэталіст» за кароткі тэрмін павялічыў сваю гандлёвую сетку з двух магазынаў да 7. Таваразварот павялічыўся з 578.000 руб. у другім квартале 1931 году да 693.000 руб. у першым квартале 1932 г. Магазыны пераведзены на гаспразлічы разрахунак з самастойным балянсам і кантакарэнтам. Работнікі прылаўку пераведзены на вызьдзельчыцу. Па-заплянавыя закупкі складаюць 66 проц. да агульнага таваразвароту. ЗРК уключыўся ў барацьбу за выкананьне прамфінпляну. Ён заключыў сацдагавор з вядучымі цэхамі заводаў імя Варашылава і «Камунар», у якім ЗРК абавязаўся пры стопроцантным выкананьні прамфінпляну дадаткова адпусьціць на кожнага рабочага з па-за плянавых заготовак масла па 1 кгр., мукі пшанічнай па 2 кгр., селядцоў па 1 кгр., бульбы па 50 кгр. і г. д. У выніку такарны цэх заводу «Камунар» выканаў прамфінплян на 129 проц., ліцейныя групы—на 103 проц. Поўнасьцю ліквідован брак па віне рабочых і ІТР гэтых цэхаў, ліквідаваны крагулы і спазьненьні на работу. ЗРК выканаў на 100 проц. заданьне па закладны парніковых рам.

Ня менныя посьпехаў дабіўся ЗРК чырвонасьцяжнай гарбарні «Бальшавік». Гадавое заданьне па паянакапленьні рэалізавана на 122 проц., а гандлёвы плян—на 105 проц. ЗРК дабіўся павялічэньня снабжэньня лепшых ударнікаў на 30 руб. у месяц кожнага. Па-заплянавыя закупкі і самазагатоўкі складаюць 40 проц. таваразвароту. Па прыкладу ЗРК «Мэталіст» заключан сацдагавор з вядучым хромавым цэхам гарбарні. Дагавор рэалізован. ЗРК арганізаваў адкормачны пункт на 50 сьвіней. ЗРК адгукнуўся на заклік заводу «Серп і молот» аб разьвядзеньні трусагадоўлі. Ужо прыступлена да арганізацыі трусагадоўчай гаспадаркі.

Пасьля рапарту ЗРК друкарні імя Сталіна прэзыдыум Белкаапсаюзу атаслаў настанову аб прэміяваньні лепшых ударнікаў каапэрацыйнага фронту.

Прэміяваны тт. **Гелін, Драпкін** (ЗРК «Мэталіст»), **Зільзэрт** (крама № 1), **Рагоўскі, Салавейчык** (ЗРК імя Сталіна), **Ліпкер, Каплан** (ЗРК «Бальшавік»), **Супражыцкі** (ЗР № 13 ЦРК) і інш.

Закрыўся ўсебеларускі зьезд ІТС

На ранішнім пасяджэньні ўсебеларускага зьезду ІТС 10 мая адбываліся спрэчкі па дакладах т. т. **Васкабойнікава** і **Розіна.** Выказалася 8 асоб. Пасьля спрэчак былі заслуханы заключныя словы дакладчыкаў.

У канцы ранішняга пасяджэньня з вялікім дакладам аб другой пяцігодцы і задачах ІТР выступіў старшыня Дзяржпляну БССР т. **Шапіра.**

На дакладу разгарнуліся шырокія спрэчкі, у якіх выказалася 12 чал. У сваіх выступленьнях дэлегаты зьезду высунулі рад практычных прапаноў па фарсаваньні складаньня пляпаў другой пяцігодкі.

На вячэрнім пасяджэньні зьезд заслухаў заключнае слова т. Шапіра і даклад мандатнай камісіі.

З прывітаньнем ад імя ЦСПСБ выступіў т. **Кавалёў.** Зьезд ухваліў ініцыятыву газэты «Тэхніка» аб выпуску значка па аўладаньні тэхнікай.

Зьезд паслаў прывітальныя тэлеграмы ЦК УсеКП(б), т. Сталіну, ЦК КП(б)Б і УсеЦСПС.

У склад пленуму БелМБІТ выбрана 37 чал., кандыдатамі—11 чал.

Пленум выбраў прэзыдыум БелМБІТ у складзе 13 чал.: т. т. Казімірчыка, Шапіра (Дзяржплян), Фурмана, Дубэра, Бурдзенева (завод «Бальшавік»), Кавалёва (ЦСПСБ), Гітмана, Бушко, Зупэрмана, Позьняка, Табула, Кардзенка і Андрыянава.

Кандыдатамі выбраны т. т. Васільлеў, Залуцкі і Шорахаў.

Дэлегатамі на ўсесаюзны зьезд ІТС выбрана 9 чал.: т.т.: Казімірчык, Фурман, Дубаў, Якімаў, Кальніцкі, Васільлеў, Гітман, Жукоўскі і Чарнякоў.

В. Якубайла

Гаспадарчы разрахунак—у саўгасы і МТС

Закон аб новай сыстэме крэдытаваньня, уведзены ў моц з 1 лістапада мінулага году, зусім сябе апраўдаў. Жорсткі бязгаўскі кантроль рублём у галіне ўзмацненьня таваразвароту, давядзеньня да парэальных разьмераў сырцовых і таварных рэсурсаў, кантроль над выкананьнем прамфінпляну даў зусім рэальныя вынікі.

Гаспадарчыя арганізацыі адчулі, што яны нясуць поўную адказнасьць за добрую работу прадпрыемства, яны сталі цікавіцца тым, каб палепшыць гаспадарку, каб узмацніць накапленьні, сталі самастойна распараджацца сваімі рэсурсамі.

Калі мы возьмем сыстэму спажывецкай каапэрацыі БССР, дык пры сярэднім звароце ў лістападзе 1931 г. таварай масы ў 26-27 дзён, у сакавіку г.г. зварот быў даведзен да 21 дня.

Значна зьнізіўся разьмер банкаўскага крэдыту прамысловасьці, сума якога на 1 лістапада мінулага году складала 31,5 млн. руб., а на 1 красавіка г.г. — 25,8 млн. руб.

Гэтыя лічбы паказваюць, што пастанова ўраду аб укараненьні гаспадарчага разрахунку, аб карэннай перабудове работы гаспадарчых органаў знайшла яскравы адбітак у гаспадарчай дзейнасьці прадпрыемстваў.

Трэба сказаць, што ў мінулыя 6 месяцаў меў месца рад фактаў пасьўнага, захаванага супраціўленьня крэдытнай рэформе. Шматлікія даныя паказваюць, што некаторыя гаспадарчыя арганізацыі і аб'яднаньні, асабліва ў першы час, упарта імкнуліся працягнуць старыя мэтады работы, — абязьлічку і бездказнасьць у распараджэньні сродкамі. Толькі рашучы кантроль рублём і жорсткае ажыцьцяўленьне пастаноў партыі і ўраду далі магчымасьць зламіць гэту ўпартасьць. Сёньня мы можам сьмела сказаць, што першы этап крэдытнай рэформы ўжо пройдзен, што сыстэма народнай гаспадаркі вытрымала экзамэн на ажыцьцяўленьне закону аб крэдытнай рэформе.

Гэты першы этап, які зьяўляецца найбольш цяжкім у частцы ўкараненьня ў практыку гаспадарчых органаў новых форм работы, закрапуў, аднак, вучастак, які найбольш лёгка паддаваўся кантролю рублём.

Дзяржбанк крэдытаваў арганізацыі з параўнальна ўзмоцненай фінансавай гаспадаркай, дзе гаспадарчы разрахунак зьяўляецца найбольш ажыцьцявімым.

Зараз крэдытная рэформа павінна быць пашырана на новую галіну народнай гаспадаркі, найбольш складаную па сваіх апэрацыях, з больш слабай фінансавай гаспадаркай, дзе гаспадарчы разрахунак укаранен зусім невыстарчальна. Гутарка ідзе аб прадпрыемствах сацыялістычнага земляробства — сельска-гаспадарчых трэстах, сыстэме Трактарацэнтру, а таксама лясной прамысловасьці, сплаве, тарфяной прамысловасьці і інш.

Гэтыя галіны народнай гаспадаркі павінны будуць трымаць сур'ёзны палітычны экзамэн.

Сацыялістычная перабудова сельскай гаспадаркі высоўвае зараз саўгасы і МТС, як адных з асноўных вытворцаў сельска-гаспадарчай прадукцыі, як фабрыкі с.-г. сырцу.

Перад гэтымі прадпрыемствамі паставлена адказная задача — па-бальшавіцку правесьці сяўбу, правесьці так, каб поўнасьцю апраўдаць назву фабрык с.-г. сырцу. Пасеўная кампанія г.г. павінна даць максымальную таварнасьць, найлепшую якасьць і значнае патаньненьне працэсаў вытворчасьці.

Пытаньне аб фінансавай гаспадарцы прадпрыемстваў Наркамзему ўвесь час знаходзілася ў цэнтры ўвагі партыйных і савецкіх органаў. Досыць адзначыць рад пастаноў, накіраваных на ўзмацненьне сыстэмы саўгасаў і МТС, на паданьне большай выразнасьці іх рабоце.

Задачы саўгасаў і МТС у гэтай галіне—узьнікшае прадукцыйнасьці працы, павышэньне рэнтабэльнасьці, узмацненьне накапленьняў і рашучае ўкараненьне гаспадарчага разрахунку. Трэба сказаць, што ў гэтай галіне гаспадарчай дзейнасьці саўгасаў і МТС справа стаіць далёка нездавальняюча.

Ня будзе вялікай памылкай, калі мы вызначым суму страт па сельгастрэстах і сыстэме Трактарацэнтру БССР у 8-8,5 млн. руб. Салідная месца належыць тут сыстэме Сьвіназаводтрэсту — 5 млн. руб.

У выніку чаго стварылася такое становішча? Яно зьяўляецца выключна рэзультатам таго, што рад нашых саўгасаў і МТС працуюць вельмі дрэнна, не навучыліся яшчэ працаваць рэнтабэльна. Даюць сябе адчуваць у радзе месц поўны самацёк і апартуністычная недаацэнка пытаньня пабудовы правільнай фінансавай гаспадаркі — гэтай базы для росту ўсёй гаспадаркі.

Некаторыя саўгасы і МТС прадалі з году ў год значныя сродкі і згортвалі сваю дзейнасьць. Замест таго, каб атрымаць ад гэтых фабрык сельгасырцу таварную прадукцыю і сырэц для прамысловасьці прыходзілася падтрымліваць гэтыя прадпрыемствы. Віну тут нясуць ня толькі нізавыя зьвенні — саўгасы і МТС. Ясна, што вінаваты дырэктар саўгасу і дырэктар МТС, калі ў яго агідна дрэнна пастаўлена работа. Але дзе былі аб'яднаньні, дзе было кіраўніцтва? Аб'яднаньні дагэтуль ня ведаюць твару усіх сваіх прадпрыемстваў, не падышлі ўсутыч да пытаньня, як трэба пабудаваць гаспадарчую дзейнасьць саўгасу і МТС.

Характэрны выпадак агіднага бюракратызму меў месца нядаўна ў сыстэме Белтрактарацэнтру. За неплацёж пратэрмінаваных крэдытаў банку было аддана пад суд кіраўніцтва Койданаўскай МТС. Чаму гэта атрымалася? Толькі таму, што Белтрактарацэнтр

С. Мэеровіч

Да чаго даводзіць работа па-старынцы

Дрэваапрацоўчы завод імя Молатава—адно з буйнейшых прадпрыемстваў гор. Менску. Завод налічвае больш 1.000 рабочых, з якіх значная частка—старыя кадры. Вытворчая праграма заводу расьце з году ў год. Заводу дан рад важнейшых заданьняў (па экспарце і інш.). Прадпрыемства мае ўсе неабходныя прадпасылкі ня толькі для выкананьня, але і для перавыкананьня вытворчай праграмы. Есьць необходныя запасы сырцу і матар'ялаў, створаны прадпасылкі для паляпшэньня матар'яльна-бытавых умоў рабочых; пабудавана добрая сталоўка, арганізавана кафэ (адзінае ў горадзе), пабудован інтэрнат па 100 рабочых і інш.

Гэтыя ўмовы даюць партыйнай арганізацыі, дырэкцыі і прафэсыянальнай арганізацыі заводу поўную магчымасьць забясьпечыць ажыцьцяўленьне вытворчых заданьняў. Аднак, завод імя Молатава сыстэматычна ня выконвае свайго прамфінпляну. 1931 г. ён скончыў з недавыкананьнем праграмы па 7 проц.; план першага кварталу 1932 г. выкананы на 94 проц.

Якія-ж прычыны сыстэматычнага адставаньня заводу? Доўгі час сярод кіруючых работнікаў прадпрыемства былі настроі, быццам галоўнай прычынай невыкананьня вытворчай праграмы зьяўляецца недахват сушыльнай плошчы.

Камісія гаркому, якая абсьледвала завод, устанавіла, што такое тлумачэньне нічога агульнага з сапраўднасьцю ня мае, што яно зьяўляецца адной з тых «аб'ектыўных» прычын, якія прыводзяцца апартуністычнымі элемэнтамі для апраўданьня сваёй нядзольнасьці працаваць.

Дзе-ж сапраўдныя карэньні невыкананьня прамфінпляну на заводзе імя Молатава? Яны — у зусім невыстарчальнай рэалізацыі 6 умоў, дрэннай арганізацыі працы, у нездавальняючай пасталоўцы ўнутры-заводзкага плянаваньня і інш. унутры-заводзкіх непаладках.

Унутры-заводзкае плянаваньне на прадпрыемстве пастаўлена надзвычай дрэнна. Дэталі загатаўляюцца зусім непрапарцыянальна: бывае, што цэхі загружаюцца лішняй колькасьцю адных дэталяй пры недахопе другіх, што надзвычай перашкаджае нармальнаму ходу вытворчай работы.

Для характарыстыкі становішча ўнутры-заводзкага плянаваньня можна прывесьці наступныя лічбы: прастоі па мэблевым цэху за першы квартал дасягаюць 25 проц. рабочага часу, прычым 19,8 проц. адносіцца выключна за лік адсутнасьці работы ў цэхах. Гэта пры выстарчальнай колькасьці сырцу, выстарчальнай колькасьці рабочай сілы, абсталяваньня і г. д.

Надзвычай дрэнна скарыстоўваецца сушыльная плошча на заводзе. Прастоі сушылак дасягаюць 12-24 гадзіны. Зусім не наладжан плянава-папярэдні рамонт варштатаў, у сувязі з чым бываюць частыя паломкі і прастоі.

Адзін цікавы факт. Паводле ўстаноўленых самім заводакіраўніцтвам норм, —у першым квартале трэба было выдаткаваць 6 тон сухога клею (асноўнага тэхнічнага матар'ялу), фактычна ўшло 6 тон і 6 клгр. сухога клею і 7 тон. 98 клгр. вадкага.

Гаспадарчага разрахунку ў цэхах няма, ня было і ў паміне. Арганізаваны 50 гаспадарчасьці з-за плённелага кіраўніцтва распаліся. Заводзкія арганізацыі ня здолелі замацаваць вытворча энтузіязму рабочых, замацаваць вытворчага энтузіязму рабочых, замацаваць выпадкавыя формы сацыялістычнага спаборніцтва.

Для таго, каб ахарактарызаваць мэтады гаспадараньня на заводзе, досыць прывесьці два прыклады. Завод мае ўласную электрастанцыю; на апошняй бываюць вельмі частыя прастоі па прычыне—як гэта ня дзіўна—адсутнасьці апалу. Між тым тэрыторыя заводу завалена адкідамі дрэваапрацоўчай вытворчасьці: лёлавінцем і інш. 6 красавіка былі выгружаны сухія дубовыя дэталі да шафаў; 7 дзён яны ляжалі на балоце і ў выніку ня могуць быць пушчаны ў далейшую апрацоўку. Такіх прыкладаў можна прывесьці шмат.

Дагэтуль не ліквідавана **ўраўнілаўка на заводзе.** Фрэзіроўшчыкі мэханічнага цэху 6-га разраду атрымліваюць 5 руб. 66 кап. у дзень, рамшчыкі лесапільнага цэху 6-га разраду—4 р. 74 кап., грунтаўшчыкі 4-га разраду—5 р. 82 кап., лякіроўшчыкі 5-га разраду—5 р. 65 кап., Як мы бачым, рабочыя сярэдняй кваліфікацыі масавых працэсаў зарабляюць больш, чым кваліфікаваны рабочы 6-га разраду. Гэта выклікае цяжучасьць рабочай сілы, асабліва па лесапільным цэху. **Зьдзелышчынай ахоплена толькі 42 проц. рабочых.** Важнейшыя працэсы работы аплачваюцца пагадзінна, падзённа.

Характэрна, што ні дырэкцыя, ні партакалектыў, ні заўком ня ведаюць, колькі процантаў рабочых ахоплена зьдзелышчынай. Зразумела адсюль, чаму зусім слаба выкананы заданьне па росьце прадукцыйнасьці працы: пры перавыкананьні заданьня па зарплаце на 107 проц. прадукцыйнасьць працы вырасла толькі на 87 проц.

На вельмі нізкім узроўні знаходзіцца працдысцыпліна. За першы квартал было 1.200 прагулаў па паўважлівых прычынах. Ніякай канкрэтнай барацьбы з прагуламі не вядзецца.

Партарганізацыя на заводзе налічвае 170 камуністаў, якія паказваюць узоры бальшавіцкай працы на вытворчасьці. **Аднак кіраўніцтва бюро партакалектыву іх работай вельмі слабае,** яно наогул праходзіць міма важнейшых момантаў работы заводу. Буйлавыя пытаньні заводзкага жыцьця: барацьба за гаспадарчы разрахунак, змаганьне з урачылаўкай і абязьлічкай, арганізацыя ўнутры-заводзкага плянаваньня, змаганьне за якасьць прадукцыі—«выпалі» з плянаў парткіраўніцтва. Характэрна, што абгаварваючы кожную дэкаду вынікі выкананьня прамфінпляну, бюро партакалектыву ўмудрылася прайсьці міма асноўных прычын невыкананьня заданьняў. Неканкрэтнасьць і адсутнасьць апэрацыйнасьці ў кіраўніцтве наглядаецца і ў цэхавых ячэйках. Для характарыстыкі адарванасьці партакіраўніцтва ад важнейшых вытворчых пытаньняў можа прывесьці такі прыклад: 9 сакавіка бюро партакалектыву разглядзела пытаньне аб становішчы гаспадарча-разрахунковых брыгад, і не зважаючы на тое, што большасьць брыгад існуе па паперы, ня выконвае свайго прамфінпляну, бюро канстатуе: «адзначыць значныя дасягненьні ў справе ўкараненьня гаспадарча-разрахунковых брыгад, што заключаецца ў росьце брыгад, якія ў асноўным выконваюць свой прамфінплян». У гэтай пастанове няма ні слова аб вялікіх прарывах у гэтай галіне, няма ніякіх канкрэтных мер па забясьпячэньні сапраўднага пералому ў працы гаспадарча-разрахунковых брыгад.

Бюро гаркому, заслухаўшы даклад заводу, зусім правільна паставіла пытаньне аб неабходнасьці ўзмацненьня партыйнага кіраўніцтва на прадпрыемстве. Урокі заводу імя Молатава павінны быць улічаны ўсёй партыйнай арганізацыяй г. Менску.

На 15 процантаў--ня менш!

У барацьбу за эканомію апалу ўцягнуць шырокія масы чыгуначнікаў

Чыгуначны транспарт спажывае каля 24 проц. усяго апалу, які скарыстоўваецца краінай. У гэтым годзе для выкананьня трансфінпляну чыгунка павінна атрымаць на 63 проц. больш апалу, чым летась. Рост патрабаваньня апалу, у сувязі з шырокім размахам сацыялістычнага будаўніцтва, з усёй вострасьцю ставіць пытаньне аб узмацненьні барацьбы за эканомію яго.

Партыя і ўрад абавязваюць чыгуначны транспарт праз мабілізацыю ўнутраных энэрга-рэсурсаў, скарыстаньне адкідаў, шляхам рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў, зьменшыць расход апалу ў 1932 годзе супроць фактычнага расходу ў 1931 годзе на 15 проц.

80 проц. усяго апалу, што адпускаецца для чыгункі, прыпадае на паравозную гаспадарку. Здаровы паравоз і выразная работа службы руху зьяўляюцца важнейшымі фактарамі эканоміі апалу.

Дае вялікую эканомію апалу і скарыстаньне перагрэтай пары, апалавыя зводы. Але Заходняя чыгунка дагэтуль ня мае плянаў сыстэматычнага ўкараненьня прылад мадэрнізацыі. Шмат паравозных брыгад ня ведаюць, як трэба даглядаць і скарыстоўваць гэтыя прылады.

Шмат апалу расходуецца марна з прычыны не прадукцыйных прастояў паравозаў на кантрольных пастох. Дзяжурныя па станцыі не папярэджваюць машыніста аб непрадугледжаных стаянках на прамежных станцыях, а дыспэтчары не паведамляюць дзяжурных па дэпо аб якасьці паравозаў у падыходзячых цягнікох. Усё гэта выклікае дарэмны выхад пары ў паветра.

На радзе дэпо наглядаюцца перапрабегі паміж прамыўкамі на 400-500 клм. Неабходна адзначыць, што перапрабегі і адсутнасьць прадуваньня

Адзін з лепшых машыністаў па эканоміі апалу т. Азарэвіч (дэпо Ворша).

катлоў значна павышае адлажэньне накіпу на паверхню нагрэву, а адзін міліметр накіпу павышае расход апалу на 10 проц., 4 мм.—на 30 проц. і г. д.

Асаблівая адказнасьць за перацыянальнае скарыстаньне апалу падае на

Машыністы Мікуловіч і Гускін перадаюць вопыт эканоміі апалу

Пастанова партыі і ўраду аб 15% эканоміі апалу абавязвае кожнага машыніста, памочніка і качагара надзвычай уважліва адносіцца да пытаньня ацяпленьня паравоза, карыстаньня мешанінай вугалю, эканоміі выдаткаваньня паравой энэргіі.

Мы ў парадку сацыялістычнага абмену вопытам хочам праз «Зьвязду» перадаць ўсім паравозьнікам свой вопыт эканоміі апалу.

Пасьля пераходу на гаспадарчы разрахунак мы дакладна пачалі вывучаць справу выдаткаваньня апалу. У выніку мы ўпэўніліся, што эканомія апалу перш за ўсё залежыць ад веданьня паравоза, умелага абыходжаньня з ім і вывучэньня профілю пуці. Бярэжлівыя адносіны, асьцярожная язда і кантроль за рамонтам — вось што неабходна для таго, каб паравоз быў здаровым і каб дасягнуць эканоміі апалу.

Практыка паказала, што лепшае параўтварэньне і меншае выдаткаваньне апалу бывае толькі тады, калі жаравыя і дымагарныя трубы, а таксама агнявая каробка рэгулярна ачышчаны ад пагару, а каласьнікі добра прачышчаны.

На нашым паравозе СУ-9769 мы ўкладаем каласьнікі з такім разьлікам, каб каля сьценак яны ляжалі шчыльней, а ў сярэдзіне радзей. Калі каля сьценак каласьнікі ляжаць рэдка, дык атрымліваецца моцны прыцёк халоднага паветра да сьценак, што выклікае цеч сувязей і пагоршаную аддачу цяпла катлу. Гэта адмоўна адбіваецца на параўтварэньні, пагоршае спальваньне газу ў топцы, бо халоднае паветра прасякае ў месца гарэньня газу праз шырокія прасьветы бакавых поласьцей каласьніковай краткі.

Шмат залежыць таксама ад таго, як тапіць паравоз. Некаторыя паравозныя брыгады топяць паравоз бакавым агнём. Мы топім роўным агнём. Такі спосаб, як паказала наша практыка, дае большы эфэкт. Мы паступова пачалі ўводзіць у карыстаньне топчыльнай з лепшых рэчаў рэпэртуару ЯДаТ.

Спэктаклем «Гірш Лекерт»—Кушнірова (пастаноўка М. Рафальскага), тэатр, на тістарычным матар'яле, разгарнуў яркі малюнак палітычнага ладу на «акраінах». У п'есе выкрываецца прыдушэньне «народцев», зубатаўшчына, зваліцтва дзікі разгром рэвалюцыйнага руху дзяржаўным апаратам жандарскай Расіі. «Гірш Лекерт» фазбройвае адраднічка-згодніцкую ролю меншавіцкага Бунду.

Недахопам пастаноўкі «Гірш Лекерт» зьяўляецца зусім слабае выяўленьне кіруючай ролі бальшавіцкай партыі ў барацьбе з Бундам, у падрыхтоўцы да рэвалюцыі 1905 году. Таксама гэта пастаноўка не паказаўлена пасобных элементаў ідэалізацыі Бунду.

П'есай Эрнста Толера «Гоп-ля жывём» (пастаноўшчык Норд) тэатр падышоў да праблемы паказу рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Эўропе, і ў прыватнасьці ў Германіі.

У спэктаклі вельмі яшчэ моцны экспрэсыяністычныя ўплывы. Рэцыдывы буржуазнага фармалізму з «Гоп-ля жывём» засталіся яшчэ і ў радзе далейшых пастановак тэатру.

Спэктакль «Глухі» (пастаноўка М. Рафальскага) зьяўляецца пераапрацоўкай навэлы Д. Бэргельсона, адбівае адзін з эпізодаў клясавай барацьбы ў яўрэйскім дарэвалюцыйным мястэчку. Мастацкі ўдала раскрыўшы вобразы адмоўных пэрсанажаў п'есы —млынара-эксплёататара Быка, яго жонкі і інш., становучы вобраз асноўнага героя—глухога рабочага, чамусь ці падан тэатрам у нейкіх сымбалічных, містычных тонах.

«Джым Купэркоп»—Годынэра (пастаноўка Літвінава) зьяўляецца другой пасьля «Гоп-ля жывём» п'есай аб рэвалюцыйным Захадзе.

Значным крокам назад была для ЯДаТ пастаноўка п'есы Даўгапольскага «Барацьба машын» (пастаноўшчык Рафальскі). У гэтай п'есе элемэнты фармалізму злучыліся з мяшчанскай, вульгарнай трактоўкай праблем рацыяналізацыі і новага быту.

Таксама няўдачай для тэатру трэба лічыць пастаноўку п'есы Бязыменскага «Стрэл» (пастаноўка Рафальскага і Норда). Сцэнічным афармленьнем тэатр узмацніў і паглыбіў памылкі п'есы літфронтаўскага, схэматычнага парадку.

У гэтай пастаноўцы тэатр палкам карыстаўся горшымі мэханістычнымі прыёмамі Мэерхольда і ТРАМ'аў раньняга пэрыяду. «Стрэл» паказваў нашу рачаіснасьць у крывым люстры.

У п'есе «На 62-м вучастку» (аўтар Дабрушын, пастаноўшчык Айзэнбэрг) бяруцца яркія факты з барацьбы за калектывізацыю сярод яўрэйскіх перасяленцаў у Крым.

Праца тэатру над «Штурмам», над п'есай украінскага пралетарскага драматурга Карнейчука (пастаноўка Норда) мае рад дасягненьняў тэатру ў сэнсе правільнага мэтадалёгічнага падыходу да вырашэньня пастаўленых перад сабою задач.

Апошний пастаноўкай тэатру зьяўляецца «Партызаны» (аўтар Аронзс, пастаноўка Рафальскага).

П'еса ня мае адзінага сюжэту. Яна зьяўляецца злучэньнем асобных спэцыфічных эпізодаў, узятых з розных пралетарскіх твораў («Першая конная», «Чапаеў» і другіх), між іншым, слаба паміж сабою зьвязаных.

***

На працягу свайго складанага творчага шляху ЯДаТ выкаваў моцна згуртаваны сцэнічны ансамбль, выхаваў пэлы рад выдатных актораў. Разам з гэтым тэатр здолеў вылучыць са свайго асяродзішча значную групу рэжысэраў—т. т. Рафальскі, Літвінаў, Норд, Айзэнбэрг, Галаўчынэр, Олэндэр, якія займаюць значнае месца сярод рэжысёрскіх кадраў БССР.

Рост і разьвіцьцё тэатру праходзілі ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы, у перамаганьні варожых уплываў. У барацьбе за высокі ідэйна-мастацкі паказ, тэатр часамі хістаўся, аддаваў на розных этапах пэўную даніну буржуазным і дробнабуржуазных уплывам, эстэцтву, фармалізму, мэханістычнасьці і нацыяналізму.

Адзначаючы пяцігадовы юбілей свае работы, тэатр павінен у парадку бальшавіцкай самакрытыкі прааналізаваць прычыны сваіх асобных парэзьняў, падагуліць вопыт, каб, перабудоўваючыся на аснове амыцыцяўленьня пастановы ЦК УсеКП(б) ад 23 красавіка 1932 году і сакавіцкага пленуму ЦК КП(б)Б, узьняць сваю работу яшчэ на вышэйшы ўзровень мастацкай і палітычнай прынцыповасьці.

Баявой задачай тэатру зьяўляецца канчатковае і больш хуткае перамаганьне ў сваёй творчай рабоце рэштак экзотыка-этнаграфічнага падыходу да выдуленьня нацыянальнай спэцыфікі, бялёгізму і ўплываў «біялёгічнай» тэорыі ў пытаньнях разуменьня нацыі. ЯДаТ павінен таксама выправіць няправільныя выказваньні свайго мастацкага кіраўніка тав. Рафальскага аб тым, што «мастацкім зьяўляецца толькі тое, што ідэалёгічна прыймальна». Гэта цьверджаньне зьяўляецца наскрозь памылковым, пабудавана на мэханістычным разрыве паміж зьместам і мастацкай формай.

Тэатр павінен шырэй разгарнуць работу па марксыцка-ленінскім выхаваньні акторскіх кадраў і ў першую чаргу маладняка. Трэба вышэй узьняць сцэнічную кваліфікацыю, мабілізаваць увесь калектыў на аўладаньне творчым мэтадам дыялектычнага матэрыялізму. Зусім неабходна ўзмацніць сувязь з рабочай грамадзкасьцю, садзейнічаць шырокаму разгортваньню вакол тэатру рабочай крытыкі, прыцягваць рабочых да непасрэднага ўдзелу ў творчай практыцы.

Надыходзячае пятнаццацігодзьдзе Кастрычніцкай рэвалюцыі, сьвяткаваньне пяцігадовага юбілею абавязваюць тэатр зрабіць больш круты пералом ва ўзьнёсьці мастацкай якасьці свае прадукцыі, мабілізаваць увесь калектыў на стварэньне сцэнічных твораў, вартых нашай вялікай эпохі —эпохі пабудовы бясклясавага грамадзтва.

«Гірш Лекерт», пастаноўшчык М. Ф. Рафальскі.
Другі акт. сц. «Экзэкуцыя». Зьлева направа актары: М. Ш[illegible] Д. Герман (Лекерт), Н. Трэстман (Файвуш).

В. ВОЛЬСКІ, М. МОДЭЛЬ

Пяць год Яўрэйскага Дзяржтэатру БССР

15 мая Яўрэйскі Дзяржаўны Тэатр БССР, а разам з ім і ўся пралетарская грамадзкасьць, сьвяткуе пяцігадовы юбілей. Праведзеная работа, мастацка - палітычныя посьпехі ЯДаТ зьяўляюцца лепшым доказам правільнасьці ленінскай нацыянальнай палітыкі і яе пасьлядоўнага ажыцьцяўленьня камуністычнай партыяй.

Посьпехі і перамогі пяцігадовай дзейнасьці Яўрэйскага Дзяржаўнага Тэатру, рост і разьвіцьцё ўсяе яўрэйскае пралетарскай культуры, асабліва ярка выпукляюцца на фоне дзікага, жудаснага становішча, у якім знаходзіліся культуры працоўных розных нацыянальнасьцяй у царскай Расіі і знаходзяцца цяпер у акупаваных Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне.

***

Дзяржаўны Яўрэйскі Тэатр БССР арганізаваўся ў кастрычніку 1923 г. Ён вырас са студыі, створанай НКА БССР, якая пяць год вучылася і праца ў Маскве.

Першыя студыйнай вучобы і першыя гады ўжо самастойнага тэатру характэрны моцнымі ідэалістычнымі ўплывамі старога МХАТ'у і з другога боку — заваёўнаньнем горшых фармалістычных бакоў у маскоўскага дзяржаўнага яўрэйскага тэатру. У гэты час малады ЯДаТ быў пад значным уплывам нацыянальнай абмежванасьці, захапляўся «бясклясавым» сусьветным мастацтвам, абыходзіў актуальную савецкую тэматыку.

Уключыўшы ў рэпэртуар творы яўрэйскіх клясыкаў (Пэрэц, Шолам-Алэйхем), клясыкаў агульна-эўрапэйскіх (Шэкспір, Мальер), студыя не змагла крытычна падыйсьці да старога клясычнага матар'ялу, не ўкмала па вынікі ленінскага разуменьня культурнай спадчыны.

Творы клясыкаў разглядаліся студыяй і яе кіраўніцтвам выключна, «як матар'ял для вучобы, як матар'ял для фармальнага самавыказваньня» (М. Рафальскі).

Першыя спэктаклі, пастаўленыя студыяй, былі запоўнены замілаваньнем да старой яўрэйскай нацыянальнай рамантыкі і экзотыкі, прасякнуты містыкай, сымболікай («На ланцугу пакуты» Пэрэца), ідэалізацыяй яўрэйскага местачковага быту («Сьвята ў Касрылаўцы»), фармалістычным эстэтызмам («Скапзн») і ідэалёгічнай чуждасьцю («Шэйлок»). Некоторым выключэньнем была сатырычная адноактоўка «Хэйдэр», скампанаваная з матар'ялаў яўрэйскіх клясыкаў (Шолам Алэйхем, Мэндэле Мойхэр-Сэфорым) і паказваная супроць яўрэйскага клерыкалізму.

Спэктаклем «На ланцугу пакуты» ЯДаТ кінуў змагацца супроць нацыяналістычных і клерыкальных традыцый і ўплываў у яўрэйскай культуры. Зброя-ж тэатру для гэтай барацьбы была старой і нягодзяй. Спэктакль быў шляхам праскянут містыкай і сымболікай, аддаваў вялікую даніну буржуазнаму эстэтызму, быў чужым для працоўнага гледача.

Інакшым было «Сьвята ў Касрылаўцы». Гэта—маляўнічая, жыцьцярадасная, не пазбаўленая этнаграфічнай афарбоўкі, камэдыя з тонкім і дайбраслушным гумэрам старых мастакоў яўрэйскай літаратуры. Старое мястэчка з яго дробнымі інтарэсамі, з яго сьвятошнай шуміхай і маленькімі «начуцьцямі» паўставала перад гледачом ва ўсёй спрыгатай шматгранасьці.

Але ўсё-ж, ня гледзячы на гротэск, на карыкатурнасьць сюжэтных вобразаў і бытавых зьявішч, тэатр ня змог крытычна ўскрыць старыя «сама бычныя» асаблівасьці старога яўрэйскага быту, не асудзіў іх. Пастаноўка атрымалася сузіральна - прымірэнчай.

З прыездам у 1926 годзе на пастаянную работу ў БССР, ЯДаТ, пры дапамозе савецкай і партыйнай грамадзкасьці, робіць рэзкі паварот у бок распрацоўкі савецкага, рэвалюцыйнага рэпэртуару, стварэньня савецкага спэктаклю. Тэатр наладжвае сувязь з буйнейшымі прадстаўнікамі яўрэйскай рэвалюцыйнай літаратуры (Безіюрка, Кушніроў, Бэргельсон, Годынэр). У 1927 годзе ЯДаТ паказвае менскаму гледачу адну са сваіх лепшых пастановак — «Ботвін».

У гэтай п'есе тэатр здолеў мастацка пераканальна паказаць высокую клясавую сьвядомасьць перадавых прадстаўнікоў пралетарыяту Польшчы. Застаюцца незабытымі глыбокія, ідэйна - насычаныя, узьнятыя на высокі ўзровень мастацкага абагуленьня, вобразы бальшавікоў польскага падпольля (Вальцар, Ботвін).

Гэты спэктакль зьявіўся этапам і для пастаноўшчыка М. Рафальскага. Пераманаючы грубыя фармалістычныя, містычна - сымбалічныя памылкі, дапушчаныя ў сваіх мінулых работах, тав. Рафальскі паставіў спэктакль «Ботвін» у плане мастацкага рэалізму. Праўда, у пастаноўцы былі пасобныя зрывы ў бок натуралізму і непатрэбнага празьмернага псыхалёгічнасьці.

Наступная пастаноўка тэатру «Авечая крыніца» (пастаноўшчык Літвінаў) зьяўляецца цікавай спробай прадзьнага выкарыстаньня на яўрэйскай савецкай сцэне праблемы клясычнай спадчыны. Адзін з лепшых твораў гішпанскага драматурга Лопа-Дэ-Вэга быў паданы тэатрам у новай арыгінальнай сцэнічнай інтэрпрэтацыі.

«Авечая крыніца» зьявілася для тэатру значным крокам наперад у сэнсе аўладаньня тэхнікай акторскага мастацтва. Яна і сёньня па праву ліч[illegible]

В. ВОЛЬСКІ, М. МОДЭЛЬ

Пяць год Яўрэйскага Дзяржтэатру БССР

15 мая Яўрэйскі Дзяржаўны Тэатр БССР, а разам з ім і ўся пралетарская грамадзкасьць, сьвяткуе пяцігадовы юбілей. Праведзеная работа, мастацка - палітычныя посьпехі ЯДаТ зьяўляюцца лепшым доказам правільнасьці ленінскай нацыянальнай палітыкі і яе пасьлядоўнага ажыцьцяўленьня камуністычнай партыяй.

Посьпехі і перамогі пяцігадовай дзейнасьці Яўрэйскага Дзяржаўнага Тэатру, рост і разьвіцьцё ўсяе яўрэйскае пралетарскай культуры, асабліва ярка выпукляюцца на фоне дзікага, жудаснага становішча, у якім знаходзіліся культуры працоўных розных нацыянальнасьцяй у царскай Расіі і знаходзяцца цяпер у акупаваных Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне.

***

Дзяржаўны Яўрэйскі Тэатр БССР арганізаваўся ў кастрычніку 1923 г. Ён вырас са студыі, створанай НКА БССР, якая пяць год вучылася і праца ў Маскве.

Першыя студыйнай вучобы і першыя гады ўжо самастойнага тэатру характэрны моцнымі ідэалістычнымі ўплывамі старога МХАТ'у і з другога боку — заваёўнаньнем горшых фармалістычных бакоў у маскоўскага дзяржаўнага яўрэйскага тэатру. У гэты час малады ЯДаТ быў пад значным уплывам нацыянальнай абмежванасьці, захапляўся «бясклясавым» сусьветным мастацтвам, абыходзіў актуальную савецкую тэматыку.

Уключыўшы ў рэпэртуар творы яўрэйскіх клясыкаў (Пэрэц, Шолам-Алэйхем), клясыкаў агульна-эўрапэйскіх (Шэкспір, Мальер), студыя не змагла крытычна падыйсьці да старога клясычнага матар'ялу, не ўкмала на вынікі ленінскага разуменьня культурнай спадчыны.

Творы клясыкаў разглядаліся студыяй і яе кіраўніцтвам выключна, «як матар'ял для вучобы, як матар'ял для фармальнага самавыказваньня» (М. Рафальскі).

Першыя спэктаклі, пастаўленыя студыяй, былі запоўнены замілаваньнем да старой яўрэйскай нацыянальнай рамантыкі і экзотыкі, прасякнуты містыкай, сымболікай («На ланцугу пакуты» Пэрэца), ідэалізацыяй яўрэйскага местачковага быту («Сьвята ў Касрылаўцы»), фармалістычным эстэтызмам («Скапзн») і ідэалёгічнай чуждасьцю («Шэйлок»). Некоторым выключэньнем была сатырычная адноактоўка «Хэйдэр», скампанаваная з матар'ялаў яўрэйскіх клясыкаў (Шолам Алэйхем, Мэндэле Мойхэр-Сэфорым) і паказваная супроць яўрэйскага клерыкалізму.

Спэктаклем «На ланцугу пакуты» ЯДаТ кінуў змагацца супроць нацыяналістычных і клерыкальных традыцый і ўплываў у яўрэйскай культуры. Зброя-ж тэатру для гэтай барацьбы была старой і нягодзяй. Спэктакль быў шляхам праскянут містыкай і сымболікай, аддаваў вялікую даніну буржуазнаму эстэтызму, быў чужым для працоўнага гледача.

Інакшым было «Сьвята ў Касрылаўцы». Гэта—маляўнічая, жыцьцярадасная, не пазбаўленая этнаграфічнай афарбоўкі, камэдыя з тонкім і дайбраслушным гумэрам старых мастакоў яўрэйскай літаратуры. Старое мястэчка з яго дробнымі інтарэсамі, з яго сьвятошнай шуміхай і маленькімі «начуцьцямі» паўставала перад гледачом ва ўсёй спрыгатай шматгранасьці.

Але ўсё-ж, ня гледзячы на гротэск, на карыкатурнасьць сюжэтных вобразаў і бытавых зьявішч, тэатр ня змог крытычна ўскрыць старыя «сама бычныя» асаблівасьці старога яўрэйскага быту, не асудзіў іх. Пастаноўка атрымалася сузіральна - прымірэнчай.

З прыездам у 1926 годзе на пастаянную работу ў БССР, ЯДаТ, пры дапамозе савецкай і партыйнай грамадзкасьці, робіць рэзкі паварот у бок распрацоўкі савецкага, рэвалюцыйнага рэпэртуару, стварэньня савецкага спэктаклю. Тэатр наладжвае сувязь з буйнейшымі прадстаўнікамі яўрэйскай рэвалюцыйнай літаратуры (Безіюрка, Кушніроў, Бэргельсон, Годынэр). У 1927 годзе ЯДаТ паказвае менскаму гледачу адну са сваіх лепшых пастановак — «Ботвін».

У гэтай п'есе тэатр здолеў мастацка пераканальна паказаць высокую клясавую сьвядомасьць перадавых прадстаўнікоў пралетарыяту Польшчы. Застаюцца незабытымі глыбокія, ідэйна - насычаныя, узьнятыя на высокі ўзровень мастацкага абагуленьня, вобразы бальшавікоў польскага падпольля (Вальцар, Ботвін).

Гэты спэктакль зьявіўся этапам і для пастаноўшчыка М. Рафальскага. Пераманаючы грубыя фармалістычныя, містычна - сымбалічныя памылкі, дапушчаныя ў сваіх мінулых работах, тав. Рафальскі паставіў спэктакль «Ботвін» у плане мастацкага рэалізму. Праўда, у пастаноўцы былі пасобныя зрывы ў бок натуралізму і непатрэбнага празьмернага псыхалёгічнасьці.

Наступная пастаноўка тэатру «Авечая крыніца» (пастаноўшчык Літвінаў) зьяўляецца цікавай спробай прадзьнага выкарыстаньня на яўрэйскай савецкай сцэне праблемы клясычнай спадчыны. Адзін з лепшых твораў гішпанскага драматурга Лопа-Дэ-Вэга быў паданы тэатрам у новай арыгінальнай сцэнічнай інтэрпрэтацыі.

«Авечая крыніца» зьявілася для тэатру значным крокам наперад у сэнсе аўладаньня тэхнікай акторскага мастацтва. Яна і сёньня па праву ліч[illegible]

ВЫПРАВІЦЬ НА-ХАДУ НЕДАХОПЫ Ў ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА ТОРФАЗДАБЫЧЫ

(Агляд рабкораўскіх лістоў)

Раньняя вясна гэтага году дала магчымасьць распачаць торфаздабычу значна раней, чым летась. Некаторыя торфазаводы (Асінторф, «Закрашынскі мох») пачалі сэзон у апошняй дэкадзе красавіка.

Паводле пляну Белторфу, 5 мая торфаздабыча павінна была разгарнуцца ў поўным аб'ёме праграмы. Аднак, далёка ня ўсе торфазаводы вытрымалі гэты тэрмін. Асноўная прычына такога становішча—слабая падрыхтаванасьць большасьці заводаў да сэзону. Невыстарчальная падрыхтоўка балотнай плошчы, слабыя тэмпы і якасьць рамонту торфамашын, а значыць зацяжка ўстаноўкі іх на балотах, значнае недавыкананьне пляну жыльлёвага будаўніцтва, што стварае напружанае становішча з разьмяшчэньнем рабочых, неналаджанасьць грамадзкага харчаваньня—вось асноўныя перашкоды своечасоваму разгортваньню торфаздабычы.

Рабкор тав. Вербін паведамляе, што торфазавод «Чырвоны сьцяг» (Смалявіцкі раён), які ў гэтым годзе павінен здабыць 47.000 тон торфу, з-за слабай падрыхтоўкі дагэтуль не распачаў яшчэ торфаздабычы. Фрэзэрны вучастак у 150 га зусім не адналірован; ня зьнята верхняга ачосу каля 50 проц. З наяўных на заводзе 5 торфамашын, адрамантаваны толькі тры. Рабочай сілай торфазавод таксама поўнасьцю не забясьпечан. Асабліва вялікі недахват тарфяніц. Замест 380 чал., завербавана толькі 200.

Торфарабачком, на чале з яго старшынёю тав. Камэневым, праяўляе поўную бязьдзейнасьць. Для сталовак няма бульбы, капусты, у той час, як былі ўсе магчымасьці для разгортваньня самазагатовак у асеньня-зімовы час. Між тым, ні торфарабкоп, ні гаспадарнікі заводу не аддаюць ніякай увагі самазагатоўкам.

Праўда, у галіне жыльлёвага будаўніцтва завод мае некаторыя посьпехі: пабудаваны тры рабочыя пасёлкі з агульнай жыллоплошчай на 830 чал. Аднак, будаўніцтва трох баракаў на 280 чал. яшчэ ня скончана.

Торфазавод «Грэбянёва», Магілеўскага раёну, таксама слаба падрыхтаваўся да сэзону. Як паведамляе рабкор тав. Драбышэўскі, вярбоўка рабочай сілы заводам праведзена ў большасьці неарганізавана. На калгасьнікаў, якія далі згоду пайсьці працаваць, складзены толькі сьпісы, дагаворы-ж з праўленьнямі калтасаў не заключаны. У выніку, калі пачалася торфаздабыча, шмат завербаваных калгасьнікаў не зьявіліся на работу. Адсутнасьць масавай работы ў часе вярбоўкі і ўзаемнай дагаворанасьці з калгасамі прывяла да таго, што пасобныя праўленьні, даўшы фармальную згоду на водпуск калгасьнікаў, зараз катэгарычна адмовіліся іх адпусьціць. Так, напрыклад, старшыня праўленьня калгасу «Спартак» (Прапойскі раён) тав. Янушкевіч, калі прыехаў прадстаўнік заводу за завербаванымі калгасьнікамі, заявіў: «Ні аднаго чалавека ты не атрымаеш, у нас з вамі дагавору няма і можаш ехаць спакойна назад». Характэрна, што старшыня Гіжэнскага сельсавету тав. Атрохаў не аказаў ніякай дапамогі прадстаўніку заводу.

Мы прывялі работу 2-х торфазаводаў, якая тыпова для многіх іншых заводаў у сэнсе іх падрыхтаванасьці да сэзону. Бязумоўна, гэта ні ў якім разе не азначае, што ў нас няма такіх торфазаводаў, якія сустрэлі сэзон у баявой гатоўнасьці. Узяць хаця-б «Закрашынскі мох», Рэчыцкага раёну, які на сёпешні дзень шырока разгарнуў торфаздабычу. Работа на машынах праводзіцца ў тры зьмены. Кожнай брыгадзе дано вытворчае заданьне. Сярод рабочых праведзена масавая работа па высоўваньні зьменна-сустрэчных плянаў. У выніку заводзкі плян у парадку сустрэчнага павялічан з 15.000 тон да 17.000(Тав. Гельфонд). Значна лепш, чым у мінулым годзе падрыхтаваліся да сэзону заводы Асінторф, імя Даўмана і інш.

Аднак, агульнае становішча з разгортваньнем торфаздабычы па БССР, нездавальняючае. Гэта патрабуе ад усіх партыйных, прафэсыянальных і гаспадарчых арганізацый, у першую чаргу тарфяной прамысловасьці, прыняць меры да таго, каб неадкладна ліквідаваць на-ходу ўсе прабелы ў падрыхтоўцы, раўняючыся па перадавых торфазаводах. Гібкае і апэрацыйнае кіраўніцтва партыйных і прафэсыянальных арганізацый на заводах—гарантыя посьпеху торфаздабычы.

Апэрацыйная зводка здабычы торфу на 7 мая

НАЗВА ТОРФАЗАВОДАЎ	Здабыта торфу у тонах	Процант выканаваньня заданьня за гэты час
„Закрашынскі мох"	170	31,1
Асінторф	1.577	45,4
Імя Даўмана	547	77,9
„Шлях сацыялізму"	416	18,3
„Свабода"	97	12,2
„Бальшавік"	18	0,6
„

ТЭРОРЫСТЫЧНЫЯ ПЛЯНЫ БЕЛАБАНДЫТАЎ І ІХ АПЯКУНОЎ

Фашыст Гаргулаў меў намер забіць тав. Даўгалеўскага

БЭРЛІН, 12. Данытаны ўчора бэрлінскай паліцыяй па справе Гаргулава белаэмігрант Якаўлеў знаходзіцца на волі. Левы пралетарскі друк паведамляе сёньня некаторыя дадатковыя падрабязнасьці аб «дзейнасьці» Якаўлева. **«Бэрлін Ам - Мортен»** указвае, што кантора Якаўлева ў Бэрліне, якая видзе нібы «гандаль шаўковымі панчохамі», надзвычай падазроная. Уласна кажучы,—піша газэта — фірма менш за ўсё падобна на гандлёвы дом. Якаўлева вельмі часта, праўда, наведвалі госьці. Аднак, гэтыя госьці былі мала падобны на купцоў. Дзелавая гандлёвая кантора прадстаўляла сабой адзін накой, у якім няма паліц для ўзораў тавараў. Відаць,—піша далей газэта, — што «гандаль ішоў слаба», што Якаўлеў нават ня мог аплачваць прыбральшчыцы. Яго канторскую работу выконвала адна машыністка. Відаць па ўсім, — указвае газэта, — што Якаўлеў ухіляўся ад сустрэчы ў сябе лішніх людзей. Час ад часу прыходзіў нейкі чалавек, які атрымліваў розныя рускія паперы і рукапісы. Куды паперы адпраўляліся з бюро Якаўлева — вядома толькі аднаму Якаўлеву. Ва ўсякім выпадку, — заключае «Бэрлін Ам - Морген», — гэтыя рукапісы мелі мала супольнага з гандлем шаўковымі панчохамі.

Адносна самога Гаргулава «Вальт Ам-Абэнд» паведамляе з Парыжу, што ў запісной кніжцы Гаргулава гаворыцца аб яго плянах забіць нямецкага рэйхспрэзыдэнта Гіндэнбурга, Чэхасловацкага прэзыдэнта Масарыка і савецкага пасла ў Францыі — Даўгалеўскага. «Бэрлін Ам-Морген» у сваю чаргу звяртае ўвагу на той факт, што Гаргулаў, прыехаўшы ў Парыж, спыніўся напярэдадні забойства ў гасьцініцы, якая знаходзіцца блізка да кватэры старога паліцэйскага шпіка Бурцава.

Парыская ахранка выгараджвае белагвардзейшчыну

ПАРЫЖ, 12. Як паведамляе **«Юманітэ»**, парыская прэфэктура перадала ўчора ў газэты для публікаваньня камунікэ аб допыце дэ - Бровара (ні адна газэта не апублікавала гэтага камунікэ). У паліцэйскім камунікэ ўстанаўляецца, што паміж дэ - Бровам і Гаргулавым ня было зносін і далей гаворыцца: «у сучасны момант паліцыя, якая ўстанавіла дзень за днём і гадзіну за гадзінай заняткі Гаргулава ў Манака да яго ад'езду ў Парыж, лічыць магчымым заявіць, што ён дзейнічаў адзін і што яго акт мог быць толькі актам адзіночкі».

«Юманітэ», канстатуючы, што гэта цьверджаньне паліцыі азначае ўжо некаторае адступленьне ў параўнаньні з тым момантам, калі паліцыя сьцьвярджала, што ў Гаргулава ёсьць «сутэдзельнікі камуністы» заяўляе: «Усё-ж мы сьцьвярджаем, што **ў Гаргулава ёсьць суўдзельнікі. Яны знаходзяцца ў Парыжы, яны арганізавалі замах, каб справакаваць вайну супроць СССР».**

Напамінаючы далей аб апублікаваных за апошнія дні довадах зносін Гаргулава з францускай паліцыяй і францускім паслом у Бэрліне, «Юманітэ» падае довады зносін Гаргулава з японскімі прадстаўнікамі ў Парыжы.

У Праскай «Прагер Тагеблят», — піша «Юманітэ» падрукавала гутарку з Маславым, кіраўніком арганізацыі белагвардзейцаў у Чэха - Славакіі «Крестьянская Россия». Маслаў заявіў, «што ў першых лічбах мая 1930 году Гаргулаў прапанаваў яму аб'яднаньне гаргулаўскай фашысцкай сілянскай арганізацыі з арганізацыяй Маслава, па - другое, што яму былі добра вядомы правакатарскія матывы паездкі Гаргулава ва Францыю, Італію, Германію, Швэйцарыю. Па - трэцяе, Маслаў сьцьвярджаў, что Гаргулаў меў пляўна доўгую гутарку з японскім консулам у Парыжы па пытаньні аб стварэньні армії ў Манчжурыі і аб удзеле ў інтэрвэнцыі супроць СССР».

Допыт белагвардзейца Якаўлева

БЭРЛІН, 11. Рэдактар белагвардзейскай часопісі «Набат» — Якаўлеў быў выклікан 11 мая ў Бэрлінскі паліцэйпрэзыдыум на допыт па справе Гаргулава. Допыт робіцца па патрабаваньні францускіх улад. Як паведамлялася ўжо, Якаўлеў знаходзіўся ў блізкіх адносінах з Гаргулавым. **«Фосішэ Цэйтунг»** паведамляе з пэўных крыніц пастунныя даныя пра Якаўлева: яму 40 год. 2 - 3 гады назад ён прыбыў у Парыж, дзе гандляваў шаўковымі панчохамі. Там ён заснаваў часопісь «Набат». У гэтай часопісі Гаргулаў ымаль'яў рад сваіх артыкулаў. Тры гады назад Якаўлеў выехаў з Парыжу ў Бэрлін. У Бэрліне ён далей выдаваў сваю часопісь. Якаўлеў, паводле вестак газэты, сустракаўся з нашыя пал - сацыялістычнымі коламі. Ён, аднак, сьцьвярджае, што «ня вёў ніякай палітычнай дзейнасьці».

На допыце ў паліцэйпрэзыдыуме Якаўлеў, паводле слоў **«Фосішэ Цэйтунг»**, заявіў, што ён у апошні раз бачыў Гаргулава ў лістападзе мінулага году і «ні ў якіх блізкіх адносінах з ім не знаходзіўся». Якаўлеў мае нансенаўскі пашпарт і, як ён сьцьвярджае, францускае консульства рэгулярна выдавала яму францускую візу для паездак у Парыж.

Надзея францускай ахранкі на белабандыта Якаўлева

БЭРЛІН, 11. Паводле паведамленьня **«Фосішэ Цэйтунг»** з Парыжу, французскія сьледчыя ўлады падазраюць, што сілкае значэньне паказаньням рэдактара белагвардзейскай часопісі «Набат»—Якаўлева. «Магчыма пават, — піша газэта, — што Францыяй будуць ужыты дыпляматычныя крокі ў мэтах атрыманьня паказаньняў Якаўлева». Газэта далей паведамляе, што адзін з кіраўнікоў партыі «зялёных» — Кімкін уцёк у Чэхаславакію. Паводле паведамленьняў «Вэльт-ам-Абэнд» у Празе, Гаргулаў заўсёды займаўся складаньнем антысавецкіх плянаў. У 1930 годзе ён прадставіў белагвардзейскаму цэнтру ў Празе вялікую колькасьць рукапісаў (ваенна-стратэгічных плянаў нападу на СССР).

Водгукі польскай прэсы на парляманцкія выбары ў Францыі

ВАРШАВА 11. «Газэта Польска» піша: «Францускія выбары пасунулі трыху налева вось, вакол якой крыталізуецца ўлада, але не павярнулі этай восі на 90 градусаў, як гэта мела месца ў Англіі, калі ўрад, замест партыйнага, зрабіўся беспартыйным, замест сацыялістычнага — кансерватыўным. Перасоўка ў Францыі здаецца нязначнай. Падобна на тое, што хутчэй мяняюцца людзі, чым палітыка, або тактыка». Кракаўскі «Ілюстраваны Кур'ер Цодзенны», падкрэсьліваючы прыяцельскія адносіны Эрыё да Польшчы, указвае, што ў часе знаходжаньня на пасадзе прэм'ера і міністра замежных спраў Эрыё польскае прадстаўніцтва ў Парыжы і францускае ў Варшаве ператорваны былі ў пасольствы». Эрыё, — дадае газэта,— зьяўляецца адным з нямногіх чужаземцаў, узнагароджаных высокім польскім ордэнам «белага арла». Адзначаючы ў канцы, што новы францускі ўрад будзе мець шмат трудасьцяй у галіне міжнароднай палітыкі, газэта ўказвае: «Эрыё будзе весьці далей сваю дзейнасьць пад ранейшымі лёзунгамі».

«Кур'ер Польскі» піша: «Перамога левых партый перадае лёс францускай рэспублікі ў рукі радыкалаў. Ад выраішэньня Эрыё, які зьяўляецца асьцярожным і спрактыкаваным палітыкам, будзе залежыць, ці паўторацца сумныя экспэрымэнты ўраду 1924 году. Тады разам з сацыялістамі ўрад пайшоў на такія крокі, якія пахіснулі па кароткі тэрмін маральны і палітычны аўтарытэт Францыі. Пачуцьцё адказнасьці прымусіць, нясумненна, Эрыё шукаць супрацоўніцтва з партыямі цэнтру».

Абвяржэньне ТАСС

ТАСС упаўнаважан абвергнуць распаўсюджаныя некаторымі замежнымі, у тым ліку японскімі тэлеграфнымі агенцтвамі і газэтамі чарговыя выдумкі японскай белагвардзейскай прэсы ў Харбіне аб знаходжаньні ў войсках генэрала Ма і старагірынцаў савецкіх інструктароў і аказаньні гэтым войскам падтрыманьня з боку СССР. Гэтыя недарэчныя чуткі зьяўляюцца правакацыйнымі і абсалютна хлусьлівымі і бясспрэчна зыходзяць з тых - жа крыніц, якія ў свой час прабавалі ўскласьці на СССР адказнасьць за зброю, якую генэрал Ма атрымаў ад некаторых японцаў.

Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі

Днепракамбінат атрымаў першы ток Днепрабуду

КІЧКАС. 10 мая ў 3 гадз. 30 мін. прамысловы ток першага генэратара Днепроўскай гідраэлектрастанцыі пашоў на ўсе заводы і цэхі Днепракамбінату і гораду Запарожжа. Генэратар працуе зусім здавальняюча і ўжо даў 268.000 квт.-гадзін электраэнэргіі.

Сабекошт энэргіі першага агрэгату ДнепрагДРЭС складае ўсяго каля 1,5 кап. за квт.-гадзіну.

Скончана сушка другога генэратара. Ударнымі тэмпамі ідзе падрыхтоўка трэцяга агрэгату да пробнага пуску.

Ёсьць першыя 40 тон труб!

ДНЕПРАПЯТРОЎСК. Завод імя Леніна атрымаў новую бліскучую перамогу на фронце барацьбы за эканамічную незалежнасьць. Пракатаны першыя 40 тон хромамалібдэнавых труб сьцьвяльнага профілю для аў, тамабільнай прамысловасьці. Першая партыя—20 тон—адгружана ў адрас маскоўскага аўтамабільнага заводу імя Сталіна.

Выкананьне прамфінпляну лёгкай прамысловасьці БССР за красавік

Прадпрыемствы наркамату лёгкай прамысловасьці выканалі прамфінплян за красавік на 93 проц. Выпушчана прадукцыі на 30.313 тысяч руб.

Ня выканалі прамфінпляну

Астатнія галіны прамысловасьці далі наступныя паказальнікі: тэкстыльная прамысловасьць дала прадукцыі на 3.257.000 руб.—94,9 проц., шкляная — на 853.000 руб.—92,7 проц., швэйная—на 18 млн. руб. — 91 проц., запалкавая—на 1.400 тыс. руб.—87,6 проц, паліграфічная—на 779.000 руб.—87,4 проц., скурапабутковая—на 4.694 тысячы руб. — 83,3 проц.

Рамонт вагонаў

За тры дні з 8 па 11 мая завод **«Польная рэвалюцыі»** выпусьціў з кан вэнцыйнага рамонту 10 вагонаў і з аварыйнага рамонту два вагоны.

НА ЗДЫМКУ: 1-ая батарэя Консавага цэху.

Марка „ХТЗ" бліскуча вытрымала выпрабаваньне

ХАРКАЎ. ТРАКТАРЫСТЫ ПАЛТАЎСКАЙ МТС, УКАМПЛЕКТАВАНАЙ, ГАЛОЎНЫМ ЧЫНАМ, ТРАКТАРАМІ «ХАРКАЎСКАГА ТРАКТАРНАГА ЗАВОДУ (МАРКА «ХТЗ»), НА СВАЁЙ ВЫТВОРЧАЙ НАРАДЗЕ ПАДВЯЛІ ПЕРШЫЯ ВЫНІКІ РАБОТЫ НОВЫХ ТРАКТАРАЎ.

УСЕ ТРАКТАРЫ, У ТЫМ ЛІКУ ВЫПУШЧАНЫЯ ХТЗ У ПЕРШЫ МЕСЯЦ ЯГО РАБОТЫ, І ТРАКТАРЫ АПОШНІХ ВЫПУСКАЎ УВЕСЬ ЧАС ПРАЦУЮЦЬ БЕЗ ПАЛОМАК І ПРАСТОЯЎ. У СЯРЭДНІМ ЗА КОЖНЫЯ 10 ГАДЗІН ТРОХКОРПУСНЫ ПЛУГ ПРЫ ДАПАМОЗЕ ТРАКТАРА МАРКІ «ХТЗ» УЗОРВАЎ БОЛЬШ 3,5 ГЭКТ.

Два цэхі краммашбуду гатовы да эксплётацыі

АРЦЕМАЎСК. На Краммашбудзе ў асноўным закончана будаўніцтва інструмантальнага і рамонта-мэханічнага цэхаў. Пачат мантаж абсталяваньня.

Пробная эксплёатацыя інструмантальнага цэху павінна пачацца 20 мая. Пуск рамонтна-мэханічнага цэху мяркуецца 1 чэрвеня.

На першай БелДРЭС

Першая БелДРЭС **за 6 мая** выпрацавала 149.000 квт.-гадзін электраэнэргіі. Максымум дасягнуў 7.600 квт., мінімум — 5.000. сярэдняе — 6.250 квт.

7 мая выпрацавана 153.000 квт.-гадзін электраэнэргіі. Максымум дасягнуў 7.750 квт., мінімум—5.000, сярэдняе—6.625 квт.

Папера

Добруская фабрыка **«Герой працы»** **8 мая** выпусьціла 71,2 тон паперы, што складае 87,4 проц. сутачнага заданьня, і 4 тоны саломеннай цэлюлёзы—34 проц. Прастой машын—17 гадзін.

За 9 мая выраблена 71,6 тон, — 87,9 проц. сутачнага заданьня і 3 тоны саломеннай цэлюлёзы—25 проц. Прастой машын—15 гадзін.

***

Папяровая фабрыка **«Спартак»** за тры дні—**8,9 і 10 мая**—выпусьціла 44.571 кгр. паперы, што складае 78,2 проц. трохдзённага заданьня. Прастой машын—33 гадзіны.

УДАРНІКІ ДЭПО ВОРША ЎКЛЮЧЫЛІСЯ Ў МЕСЯЧНІК ПРАВЕРКІ ПЕРАБУДОВЫ РАБСЕЛЬКОРАЎСКАГА РУХУ

Узятыя самаабавязацельствы—поўнасьцю выканаць

У сувязі з абвешчаным месячнікам масавай праверкі і самаправеркі выкананьня пастаноў ЦК УсеКП(б), ЦК і ЦКК КП(б)Б аб перабудове рабселькораўскага руху рабочыя і ПТР дэпо Ворша прынялі на сябе рад самаабавязацельстваў і выварнуліся з лістом да ўсіх чыгуначнікаў БССР.

У гэтым лісьце рабочыя дэпо пішуць:

— Перад сацыялістычным транспартам стаяць вялізарныя задачы па перавозках грузаў нашаму сацыялістычнаму будаўніцтву. Роля пралетарскага друку, рабкораў, якія зьяўляюцца «камандзірамі пралетарскай грамадзкай думкі, якія імкнуцца накіраваць невычарпальныя сілы гэтага вялізарнага фактара на дапамогу партыі і савецкай улады ў дзяржай справе сацыялістычнага будаўніцтва» ў гэтай справе надзвычай адказная. Яны павінны яшчэ больш павысіць свой удзел у барацьбе за выкананьне пастаўленых перад транспартам задач.

На аснове перабудовы партыйна-прафсаюзнай масавай работы, умацаваньня пізавога зьвяна і друку дэпо дасягнула значнага эруху ў выкананьні вымяральнікаў. Хворых паравозаў ніжэй нормы на 2 проц. У выніку павышэньня якасьці работы скараціліся паўторнасьці з 39 у сакавіку да 6 у красавіку. Спараная язда замацавана на 96,4 проц., сярэдня-сутачны прабег пасажырскага паравоза за трэцюю дэкаду красавіка выкананы на 106,8 проц., таварнага — на 101,6 проц. Ліквідаваны прагулы і спазьненьні на работу ў вядучых цэхах рамонту.

За час II усесаюзнага і ўсебеларускага конкурсу спараных брыгад, дзякуючы ўвазе да гэтага пытаньня з боку друку і рабкораў дасягнуты значныя вынікі ў павялічэньні карыснай работы паравознага парку. 14 паравозаў выканалі і перавыканалі ўмовы конкурсаў. Абменны пункт атрымаў другую дарожную прэмію ў 1.750 руб. за перавыкананьне ўмоў конкурсу.

Ёсьць некаторыя посьпехі і ў справе арганізацыі працы. Пераход на сутачнае плянаваньне работ па кожнай брыгадзе і ўкараненьне гаспадарчага разрахунку па паравозах і ў брыгадах далі значны эфект у эканоміі матар'ялаў і ўзьняцьці прадукцыйнасьці працы. Ва ўсім гэтым вялікую ролю адыграў пізавы друк, які праводзіў апорацыйную работу па барацьбе за заваяваньне пярэдніцтва ва ўсесаюзным і ўсебеларускім конкурсах.

Рабочыя і ПТР дэпо Ворша зьвярнуліся да ўсіх чыгуначнікаў з заклікам па ўдарнаму правесьці месячнік праверкі і самаправеркі рэалізацыі пастаноў аб перабудове рабселькораўскага руху, увязаўшы гэта з барацьбой за выкананьне і перавыкананьне колькасных і якасных паказальнікаў прамфінпляну, з рэалізацыяй 6 умоў тав. Сталіна, узмацненьнем пізавога партыйнага і прафсаюзнага зьвяна. Рабочыя абавязваюцца ліквідаваць самае слабае месца ў рабоце — перапрастой паравозаў у прамывачным рамонце, парушэньне праддысцыпліны, паўторнасьць рамонту і г. д. Рабочыя таксама абавязаліся прыцягнуць непасрэдны ўдзел у палепшэньні работы пасьценных газэт, у разгортваньні сеткі газэт, рэалізаваць на справе лёзунг партыі «кожны ўдарнік — рабкор, кожны рабкор — ударнік».

У адпавеку 20-годзьдзя «Працы» рабочыя прынялі на сябе абавязацельствы вывучыць гісторыю не бярэцьбы з апартунізмам, за марксызм-ленінізм, за згуртаваньне рабочай класы пад сьцягам кампартыі. Па дэпо будуць праведзены рэйды праверкі выкананьня самаабавязацельстваў па сталінскім паходзе і 2-гім усесаюзным і ўсебеларускім конкурсах спараных брыгад. Задача заключаецца ў тым, каб замацаваць тыя посьпехі, якія дасягнуты за час праведзеньня сталінскага паходу і конкурсу спараных, пашырыць лепшы вопыт брыгад і ўдарнікаў на адстаючых, дабіцца новых перамог.

Вызначана правесьці таксама рэйды праверкі выкананьня рабочых прапаноў і рэагаваньня па рабкораўскія заметкі.

Рабочыя ўзялі на сябе абавязацельства выканаць на 15 дзён раней тэрміну спэцрамонт паравозаў і капэнцыйны рамонт вагонаў, сабраць 100 рацыяналізатарскіх прапаноў, пашырыць дадатковую падпіску на менш як па 30 экзэмпляраў часопісі «Партработа в цэхе», 20 экз. часопісі «Рабоче-крестьянский корреспондент», 150 экз. «Зьвязды» і 100 экз. «Рабочай». Арганізаваць ва ўсіх цэхах пасьценгазэты, прычым у прамывачным цэху і ў паравозьнікаў выпускаць штодзенкі.

На працягу месячніка пастаноўлена прапусьціць праз 6-цідзённыя курсы ўсіх рэдактароў пасьценгазэт. Рабкоры абавязаліся рэгулярна наведваць партыйна-тэхнічную вучобу. З агульнага графіку масавай работы два дні ў месяц вызначаны для работы рабкораў і калектыўных чытак газэт і часопісяй («дні друку»).

На пабудову дырыжабля «Рабкор-транспартнік» рабочыя пастанавілі сабраць ня менш 1.000 руб. У мэтах ахопу палітычнай, тэхнічнай і мастацкай літаратурай усіх рабочых арганізуецца 10 брыгад кніганош па цэхах і для разноскі на дом.

Рабочыя Аршанскага дэпо пастанавілі выканаць узятае самаабавязацельства да 1 чэрвеня і заклікалі наследаваць іх прыкладу ўсіх чыгуначнікаў БССР.

Я.

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

Сёньня, у 7 гадз. 30 м., у клюбе імя VII зьезду прафсаюзаў Бел. (б. клюб Саўгандальслужачых—пог Камуністычнай і Энгельса)

склікаецца

АГУЛЬНА-ГАРАДЗКІ СХОД ПРАФАКТЫВУ.

Парадак дня:

Выніні IX Усесаюзнага зьезду прафсаюзаў (дакл. т. **Шульціна**).

Яўна старшынь ФЗМК, цэхкомаў, прафоргаў і ўсяго прафактыву г. Менску **абавязкова.**

Білеты разасланы па фабзаўмясцкомах.

ГАРПРАФСАВЕТ.

Рэдакцыя „ЗЬВЯЗДЫ" і ЦКК НК-РСІ БССР

СКЛІКАЮЦЬ

ШЫРОКУЮ НАРАДУ

ПРАДСТАЎНІКОЎ ГАСПАДАРЧЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ ПА ПЫТАНЬНЯХ

СТВАРЭНЬНЯ КАРМОВАЙ БАЗЫ.

На нараду павінны зьявіцца прадстаўнікі: Наркамзему, Сьвінаводтрэсту, Малапкопрамтрэсту, Птушкатрусаводтрэсту, Насенаводтрэсту, Ільнатрэсту, Садгародтрэсту Малако—і Сьвінавозабъединаньню, Белкалпасаюзу, Трэсту лугавых гаспадарак, Калгас цэнтру, Сьвінаводкалгассаюзу, Мясамалакокалгассаюзу, Інстытуту рэканструкцыі, Інстытуту Сьвінагадоўлі, Белсельбуду, і Колгасбуду.

Нарада адбудзецца 14 мая, а 6 гадзіне ўвечары ў памяшканьні рэдакцыі „Зьвязды" Савецкая 63, трэці паверх.

Рэдакцыя „Зьвязды"

ЦКК НК-РСІ.

15 МАЯ

склікаецца чарговы пленум

ЦЭНТРАЛЬНАГА ПРАЎЛЕНЬНЯ САЮЗУ ПРАЦАСЬВЕТЫ БССР

З НАСТУПНЫМ ПАРАДКАМ ДНЯ:

1. Вынікі сакавіцкага Пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б.
2. Вынікі IX-ўсесаюзнага зьезду прафсаюзаў і VIII усесаюзнага зьезду саюзу працасьветы.
3. Аб 2-м пяцігадовым пляне культурнага будаўніцтва.
4. Аб ходзе рэалізацыі пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб пачатковай і сярэдняй школе.

Пачатак Пленуму 15-У г. г. у 6 гадз. веч. у памяшк. Дому Асьветы.

Яўка старшынь МК, ГК саюзу працасьветы г. Менску—абавязкова.

Запрашаюцца ўсе члены саюзу працасьветы.

14-га мая ў 5 гадз. вечара, у памяшканьні ЦК ЛКСМБ (Рог Чырвонаармейскай і К. Маркса, 1-шы паверх, пак. № 11) склікаецца

НАРАДА савецкіх, гаспадарчых і грамадзкіх арганізацый па пытаньні аб падрыхтоўцы да 10-цігодзьдзя піянэрарганізацыі і рэалізацыі пастановы ЦК УсеКП(б) ад 21-IV 1932 г. аб піянэрруху.

На нараду выклікаюцца прадстаўнікі ад ВСФКВ, т-ва „Прыхільнік Дзяцей", „Чырвонага Крыжу", т-ва „ОПТЭ", ЦСПСБ, Белдзяржкіно, НКАсьветы, Галоўмастацтва, т-ва „Прыхільнік Радыё", ЦС Асоавіяхіму, НКАЗдароўя, БКС.ЦК МОПР'у Цэнтр. Дзіцяч. камісіі, ДВБ, БелАПП, рэд. газ. „П. Б.", „Ю. Л.", рэд. „Піянэр Беларусі па радыё", рэд. „Ч. З.", рэд. „Ю. А.", рэд. газ. „Калгасьнік Беларусі па радыё", рэд. „Іскры Ільліча", Гарана і Гар. Бюро ДКП.

ЦБ ДКА ЦК ЛКСМБ.

ПАВЕДАМЛЯЕЦЦА, ШТО **КАНТОРА БЕЛЗАГОТЖЫВЁЛА** 7 мая з Савецкай вул. № 45. *ПЕРАМЯСЬЦІЛАСЯ* **на Нямігу № 9** (у памяшканьне раней займанае Саюзпрамкорнам у Менску)

„ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА".	Гукавы гаварушчы мастацкі фільм **ВАМ ЗНАЙДЗЕЦЦА РАБОТА**
Інтэрнацыянал"	Новы мастацкі фільм **ІХНЯЯ ШЛЯХІ РАЗЫШЛІСЯ**
ПРАЛЕТАРЫ	Мастацкі фільм *ВАДАВАРОТ* драма ў 6 частках.
„СПАРТАК". Пач.: 7-15, 9, 10-45 ЖАСА—ад 5 гадз.	З 13 мая выдатны фільм *СЫН КРАІНЫ* ў 6 частях.

Згодна пастановы СПА ад 18-IV і СНК ад 26-IV—32 г.

БЕЛКАНТОРА „САЮЗПРАМКОРМ"

ЛІКВІДУЕЦЦА

Прэтэнзіі, якія маюцца да Белканторы „Саюзпрамкорм", належыць прадявіць у ліквідком

да 15 чэрвеня 1932 г.

Пасьля паказанага тэрміну ліквідком ніякіх прэтэнзій прымаць **ня будзе.**

Адрас ліквідкому—Менск, Савецкая, 46.

ліквідком.

П. Андроўскі

Забойства прэзыдэнта францускай рэспублікі

Забойства прэзыдэнта францускай рэспублікі п. Думэра, якое было зроблена рускім эмігрантам-белагвардзейцам, кідае яркае сьвятло на тую агідную падрыўную работу, якую на працягу году-год вядуць белагвардзейскія эміграцкія арганізацыі. За апошні час гэта злачынная работа набыла асабліва актыўны і пагражаючы характар. Стрэл белагвардзейца Гаргулава ў прэзыдэнта францускай рэспублікі прадстаўляе сабой чарговы тэрарыстычны акт, які, па думцы яго выканаўцы і арганізатараў, павінен быў служыць мэтам антысавецкай правакацыі. Напад на п. Думэра ўплятаецца ў доўгі ланцут напярэдніх актаў тэрору і правакацый. Канчаткова страціўшая ўсякую глебу пад нагамі, ашалелая ад грандыёзных посьпехаў мірнага сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР, азьвярэлая белагвардзейская зграя ліхаманкава мітусіцца ў пошуках якога-небудзь спосабу справакаваць антысавецкую авантуру.

За самыя апошнія месяцы мы мелі рад доказаў ліхаманкавай актывізацыі тэрарыстычнай дзейнасьці белаэмігрантскіх арганізацый. Толькі нядаўна была выкрыта падрыхтоўка тэрарыстычнага акту супроць японскага пасла ў Маскве, якая мела на мэце справакаваць канфлікт паміж СССР і Японіяй. Яшчэ сьвежы ўспаміны аб судовым працэсе контр-рэвалюцыянэраў Штэрна і Васільлева, якія па ўказцы замежных інтэрвэнцыяністкіх груповак задумалі замах супроць нямецкага пасла ў СССР, замах, які ледзь не каштаваў жыцьця дарадцы нямецкага пасольства п. Твардоўскага.

На вопыце 14 з паловай год існаваньня савецкай улады белагвардзейская эміграцыя павінна была пераканацца ў сумным краху ўсіх сваіх разьлікаў на ўнутраны пераварот у СССР, на мабілізацыю ўнутры СССР нейкіх сіл для зьвяржэньня савецкай улады і аднаўленьня ўлады памешчыкаў і капіталістаў. Белагвардзейская эміграцыя са скрыгатам зубоў наглядае, як з году ў год усё больш і больш згуртоўваюцца вакол кампартыі і савецкай улады пматмільённыя масы рабочых і сялян, натхнёныя грандыёзнымі перамогамі сацыялістычнага будаўніцтва. Вялізарныя посьпехі палітыкі індустрыялізацыі нашай краіны і калектывізацыі сельскай гаспадаркі і на яе аснове ліквідацыі кулака як клясы, пазбаўляюць буржуазна-манархічную эміграцыю апошняй надзеі на рэстаўрацыю капіталізму ў СССР.

Прыціснутая да сьцяны, зусім дэмаралізаваная і разумеючая сваю гістарычную асуджанасьць, белагвардзейская эміграцыя бачыць для сябе адзіны прамень надзеі толькі ў адным: **ва што-б там ні стала справакаваць вайну супроць СССР для таго, каб у хаосе вайны і інтэрвэнцыі паспрабаваць вярнуць сабе страчаныя пазыцыі.** Для гэтай мэты, з пункту гледжаньня ашалелых белагвардзейскіх бандытаў, усе сродкі добрыя. Калі сарвалася спроба забіць японскага пасла ў СССР, дык чаму не паспрабаваць забіць германскага пасла ў Маскве—п. Дырксена? Калі і гэта не ўдалося, дык чаму не паспрабаваць забіць францускага прэзыдэнта?

Малюнак апошняга тэрарыстычнага акту белагвардзейцаў, ахвярай якога паў прэзыдэнт францускай рэспублікі, і тая абстаноўка, у якой гэты акт быў зроблен, настолькі вычарпальна ясныя, што не патрабуюць ніякіх камэнтараў. Забойца—Паўла Гаргулаў зьяўляецца, па ўласным прызнаньні, даным ім пры допыце, **белагвардзейскім эмігрантам і актыўным контр-рэвалюцыянэрам.** Яго эміграцкая кар'ера праходзіць у Варшаве, Празе і ў Францыі, якраз у тых краінах, **якія вядомы гасьціннасьцю, аказваемай імі найбольш актыўным эміграцкім контр-рэвалюцыйным арганізацыям.** У 1930 годзе Гаргулаў заснаваў у Празе фашысцкую групу пад назвай «Усерасійскай Народнай Сялянскай Партыі «Зялёных». Група гэта апублікавала сваю «праграму», якая прадстаўляе сабой адозву «да насельніцтва СССР». Каб меркаваць аб характары гэтай праграмы, даволі прывесьці наступную вытрымку з яе: «Савецкую-ж уладу ў Расіі ні адна чужаземная дзяржава ў сьвеце ня прызнае таму, што гэта ня руская народная ўлада, гэта проста шайка разбойнікаў». Малюючы сумную карціну «заняпаду» народнай гаспадаркі СССР, «праграма» фашысцкай партыі Гаргулава і кампаніі ўскрыквае: «Што-ж рабіць, які-ж выхад? Выхад адзін—дзяржаўны пераварот, новая рэвалюцыя. Перабеце ўсіх важакоў-камуністаў, разбойнікаў, грабежнікаў, ворагаў рабочых і сялян».

Гаргулаў і К-°, аднак, вельмі добра сабе ўяўляюць басьсьлінасьць сваіх заклікаў. Таму адначасова з апублікаваньнем сваёй «праграмы» ён арганізуе тэрарыстычную групу ў 30 чалавек. Са знойдзеных у Гаргулава францускай паліцыяй дакумантаў відаць, што Гаргулаў паставіў сабе мэтай «забіць кіраўніка францускай нацыі, якая, па яго думцы, нічога не зрабіла, каб дапамагчы Расіі вызваліцца ад савецкага ярма». На допыце Гаргулаў падцьвердзіў, «што ён хацеў забіць прэзыдэнта рэспублікі, бо Францыя дапамагае бальшавіком, а Эўропа і Амэрыка даюць саветам групы для ўзмацненьня бальшавізму».

Гэтых цытат з матар'ялаў сьледзтва, зробленага францускімі ўладамі, і паданых афіцыёзным францускім агенцтвам Гавас, даволі для таго, каб пераканацца, што **замах на францускага прэзыдэнта зыходзіць з тых-жа колаў, якія кіравалі арганізацыяй замаху на японскага і германскага паслоў у СССР.** Нельга не адзначыць, што іменна ў Францыі гэтыя колы мелі магчымасьць арганізаваць і весьці сваю злавесную «работу» асабліва вольна і беспакарана.

Нашаму друку ня раз даводзілася ўказваць на тую пагрозу для франка-савецкіх адносін і для справы ўсеагульнага міру, якая зьвязана з фактам адкрытага і афіцыяльнага існаваньня ў Францыі інтэрвэнцыяністкіх белаэмігрантскіх ваенных арганізацый, што вялі адкрытую прапаганду і падрыхтоўку ўзброенага нападу на СССР. Гэтыя арганізацыі нікольні не сароміліся адкрыта ўсхваляць тэрарыстычныя замахі супроць чужаземных дзяржаўных дзеячоў, як мэтад барацьбы з савецкай уладай, пляхам падрыву зносін савецкай дзяржавы з другімі краінамі. Як вядома з наведамленьняў белаэмігрантскага друку, пасьля расстрэлу контр-рэвалюцыйных тэрарыстаў Штэрна і Васільлева, рускім белагвардзейцамі ў Парыжы была адслужана паніхіда па гэтых «мучаніках» за справу контр-рэвалюцыі. «Гераічны» учынак Штэрна выхваляўся таксама Керэнскім у яго «органе» «Дні» у нумарох ад 20 сакавіка і 17 красавіка. Наколькі нам вядома, ні Керэнскі, ні арганізатары паніхіды па Штэрне, **не прасьледваліся францускай уладай,** ня гледзячы на тое, што **францускія законы прадугледжваюць суровыя меры за «апалёгію злачынных дзеяньняў».**

Але контр-рэвалюцыйная эміграцыя прызвычаілася адчуваць сябе ў Францыі, як у сваім доме. Яна прызвычаілася да мысьлі, што ніякія нормы між народнага права і ніякія ўнутраныя законы ця могуць сьцясьніць неабмежаваную свабоду правакацыйнай антысавецкай актыўнасьці. Яны прызвычаіліся да таго, што ім дазваляюць прымаць удзел у афіцыяльных урачыстасьцях, прызвычаіліся да таго, каб іх разглядалі ў кіруючых колах, як аўтарытэтных «дарадцаў» па «рускіх» справах.

З другога боку, падзеі на Далёкім Усходзе выклікалі ліхаманкавае ажыўленьне ў колах белай эміграцыі. Белагвардзейскую эміграшчыну акрылілі новыя надзеі, яе вачом адкрыліся новыя дэрспэктывы: пэрспэктыва новай грандыёзнай вайны, грандыёзнай крывавай авантуры, у якую яны разьлічвалі ўцягнуць СССР.

Аднак, цьвёрдая і пасьлядоўная палітыка міру савецкага ўраду, якая разьбіла ўсе спробы справакаваць СССР на ўзброены канфлікт, прынесла белагвардзейцам горкія расчараваньні і давяла іх да надзвычайнага шаленства. У сваім імкненьні справакаваць вайну белагвардзейцы гатовы ісьці на ўсё, нават на самыя крайнія сродкі, каб толькі яны маглі выклікаць ускладненьні паміж СССР і якой-небудзь з буйных капіталістычных дзяржаў.

У гэтых умовах ня дзіўна, што ў розумах агалцелых бандытаў магла ўзьнікнуць мысль аб замаху на францускага прэзыдэнта. Ва ўсякім выпадку, адказнасьць за гэта кладзецца ня толькі на белагвардзейскую эміграцыю, але і на тыя францускія колы, якія сваім патураньнем, а часам простым і адкрытым падтрыманьнем ства рылі ў белагвардзейскай эміграцыі перакананьне ў яе беспакаранасьці.

Некаторыя францускія колы не пасароміліся нават перад тварам зусім бясспрэчных фактаў, зрабіць спробу прадставіць Гаргулава, як... «нэобальшавіка», які дзейнічае ледзь ня ў ролі агента... трэцяга Інтэрнацыяналу. Арганізаваная Гаргулавым контр-рэвалюцыйная фашысцкая «сялянская партыя» ў адным з апублікаваных у Парыжы камунікэ паказваецца, як «нэобальшавіцкая» і зьвязаная з Камінтэрнам. Пасьля таго, што было падана вышэй аб праграме гэтай «партыі» і аб заявах забойцы, францускім сьледчым уладам няма патрэбы выкрываць гэту грубую і няпісьменную хлусьню. Мэта гэтай тапорнай інсынуацыі зусім відавочна. Яна была пушчана ў друк 7 мая, г. зн. напярэдадні другога туру выбараў у палату. Відав